РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 САКАВІКА 2025 г. СЕРАДА № 49 (30437)

МОВА ПАВАГІ І АДКРЫТАСЦІ, ЗРАЗУМЕЛАЯ БЕЗ ПЕРАКЛАДЧЫКА

Учора ў Палацы Незалежнасці Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прымаў даверчыя граматы паслоў дзевяці краін. Дыпламаты прадстаўляюць розныя кантыненты, розны дзяржаўны і грамадскі лад. Але Беларусь гатова весці канструктыўны дыялог з усімі, калі гэты дыялог на роўных... Другая сустрэча ў палацы — хутчэй не міжнародная, а сяброўская — з губернатарам Прымор'я Алегам Кажамякам. (Працяг на 2–3-й стар.)

ПАДЗЕЯ

СТАРТАВАЛА СВЯТА КНІГІ

Сёння — урачыстае адкрыццё XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу

Выстаўка-кірмаш будзе дзейнічаць да 16 сакавіка і стане сапраўдным святам для аматараў якаснай літаратуры. Аб гэтым сведчыць як колькасць экспанентаў — іх больш як 500 з 21 краіны, так і насычаная праграма форуму. Улічваючы, што Беларусь старшынствуе ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза, на цэнтральным стэндзе сёлета будзе прадстаўлена інтэрактыўная калектыўная экспазіцыя дзяржаў — удзельніц ЕАЭС, аб'яднаная агульнай тэмай — 80-годдзе Вялікай Перамогі, падзяліліся арганізатары. Таксама на выстаўцы можна будзе пазнаёміцца з культурнымі, літаратурнымі традыцыямі краін, пасольствы якіх адгукнуліся на прапанову беларускага боку: кожны дзень выстаўкі-кірмашу будзе прысвечаны дзяржаве — ўдзельніцы ЕАЭС.

СТАР. 11

На пляцоўцы Выдавецкага дома «Звязда» вас чакае шмат цікавага.

Фота з архіва БелТА.

ГРАНТЫ – ТАЛЕНАВІТЫМ! 5

МАНІТОРЫМ ЦЭНЫ АД СУПЕРМАРКЕТА ДА АЎТАКРАМЫ МС

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

«НАША ЗАДАЧА — РАБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ»

Праверка баявой гатоўнасці ва Узброеных Сілах выходзіць на завяршальны этап

У аўторак на 227-м агульнавайсковым палігоне адбыўся асноўны этап вучэння падраздзяленняў, якія прыцягваюцца да праверкі баявой гатоўнасці Узброеных Сіл. У ходзе тактычнага эпізоду ваеннаабавязаныя вялі агонь па ўмоўным праціўніку з рознага роду зброі. Авіяцыя, артылерыя, беспілотныя лятальныя апараты, выбухі і стрэлы гармат — нягледзячы на непагадзь, на палігоне было сапраўды горача. Карэспандэнты «Звязды» далучыліся да захапляльнага мерапрыемства.

СТАР. 12-13

Фота Лізаветы ГОЛАД.

«МОВА ПАВАГІ І АДКРЫТАСЦІ ЎНІВЕРСАЛЬНАЯ. ДЛЯ ЯЕ НЕ ПАТРЭБЕН ПЕРАКЛАДЧЫК»

Аб чым Прэзідэнт гаварыў з замежнымі дыпламатамі

У Палацы Незалежнасці зноў шмат замежных гасцей. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў даверчыя лісты ад паслоў дзевяці краін. Гэта прыгожая дыпламатычная традыцыя, калі паслы, якія пачынаюць сваю кадэнцыю, найперш сустракаюцца з кіраўніком дзяржавы, у якой будуць працаваць, і перадаюць яму даверчыя лісты. Такім чынам выказваецца жаданне новага пасла садзейнічаць далейшаму развіццю і паглыбленню адносін паміж дзвюма краінамі. Для паслоў, якія будуць працаваць у Беларусі, гэта жаданне ўзаемнае.

З Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Малайзіі ў Рэспубліцы Беларусь Лун-Лаі Чэонгам.

«Кадэнцыя новага пасла ў краіне знаходжання — гэта своеасаблівы этап у двухбаковых узаемаадносінах. Праактыўная і мудрая работа кіраўніка дыпламатычнага прадстаўніцтва здольна істотна ўмацаваць кантакты паміж цэнтрамі, узняць іх на новы ўзровень на карысць нашых краін і народаў, — прывітаў гасцей кіраўнік дзяржавы. — Спадзяюся, перыяд службы ў Беларусі будзе напоўнены для вас цікавымі падзеямі, новымі знаёмствамі і масай карысных мерапрыемстваў, якія дазволяць нам сумесна рэалізаваць шмат узаемавыгадных праектаў. Мы для гэтага ў Беларусі адкрытыя».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што паслы будуць мець магчымасць не раз пераканацца, што Беларусь зусім іншая, чым яе часта спрабуюць прадставіць, выкарыстоўваючы толькі чорныя фарбы і паток негатыву.

«Насуперак заходнім стэрэатыпам мы паспяхова развіваемся. Нягледзячы на ціск, які аказваецца звонку, усебакова павышаем свой патэнцыял і прапануем нашым сябрам і партнёрам усё самае лепшае, напрацаванае дзясяткамі гадоў, у навуцы, адукацыі, ахове здароўя, прамысловасці, сельскай гаспадаркі», — заявіў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што ў Беларусі гэты год пачаўся з важнай палітычнай кампаніі — выбараў кіраўніка дзяржавы, на якіх грамадзяне краіны пераканаўча выказаліся за працяг курсу на пабудову моцнай, незалежнай, сацыяльна арыентаванай дзяржавы.

«Мы называем яе дзяржавай для народа, якая хоча жыць у міры і згодзе з усімі краінамі незалежна ад іх велічыні, пазіцыі ў сусветных рэйтынгах ці месцы на карце, — удакладніў беларускі лідар. — Гэта і ёсць сутнасць нашай замежнай палітыкі, нашых падыходаў да выбудоўвання стасункаў з суседзямі і геаграфічна аддаленымі ад нас краінамі.

Паверце, там, дзе нам не прад'яўляюць ультыматум, дзе не дыктуюць умовы, дзе мы бачым супадзенне поглядаў і ўяўленняў, не перашкодзіць ні адлегласць, ні розныя веравызнанні ці культурныя традыцыі, каб дамовіцца. Мова павагі і адкрытасці ўніверсальная. Для яе не патрэбен перакладчык. Яе разумеюць на ўсіх кантынентах. Патрэбны толькі добрая воля і, як гавораць у нас у народзе, не трымаць камень за пазухай».

«МЫ ВЫСТУПАЕМ ЗА МІРНАЕ ВЫРАШЭННЕ ЛЮБЫХ КАНФЛІКТАЎ»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што палітыка міралюбнасці, добрасуседства і сумленнасці прадвызначана нашай гісторыяй. За ўсе папярэднія стагоддзі свой ліміт войн і турбулентнасці беларусы вычарпалі. Беларускі лідар нагадаў, што сёлета мы адзначаем 80-ю гадавіну Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, якая забрала жыццё кожнага трэцяга грамадзяніна нашай краіны і пацягнула фатальныя разбурэнні большай часткі тэрыторыі і эканомікі Беларусі. «У 1945 годзе дзякуючы савецкаму народу быў разгромлены фашызм, усе народы Еўропы змаглі ўздыхнуць свабодна і пачаць вяртанне да мірнага жыцця. У знак міжнароднага прызнання ўкладу беларускага народа ў самаадданую барацьбу з нацызмам Беларусь увайшла ў лік краін — заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый...

Вы не раз пераканаецеся, падарожнічаючы па нашай краіне, знаёмячыся з яе жыхарамі, што падзеі той вайны пакінулі глыбокі след у гісторыі Беларусі, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да паслоў. — А святая памяць аб герояхвызваліцелях, клопат аб ветэранах, догляд помнікаў і месцаў пахаванняў, недапушчальнасць перапісвання гісторыі — сутнасць дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі сучаснай беларускай дзяржавы».

Прэзідэнт удакладніў, што гэта не праява нашай ваяўнічай палітыкі, як бы гэта камусьці ні хацелася такім чынам прадставіць. «Нам проста вельмі высокай цаной дасталася перамога, і мы вельмі добра ведаем увесь цяжар страт, якія прынесла нам вайна», — растлумачыў ён.

Аляксандр Лукашэнка расказаў паслам, што ў Беларусі праводзяцца маштабныя даследаванні па выяўленні злачынстваў нацыстаў і іх саўдзельнікаў. І тыя факты, якія нават толькі цяпер адкрываюцца, прымушаюць нас па-новаму ўсвядоміць сапраўдную глыбіню і маштабы Вялікай Айчыннай вайны. «Таму на ўсіх узроўнях мы штодня вядзём работу, каб выключыць любыя рознагалоссі ў грамадстве, падтрымліваем міжнацыянальны і міжканфесійны мір і згоду, нікому не пагражаем, але пры гэтым умацоўваем эканамічныя асновы і абараназдольнасць нашай дзяржавы. Мы выступаем за мірнае вырашэнне любых канфліктаў дыпламатычным шляхам і прыкладаем значныя намаганні для найхутчэйшага ўрэгулявання ўзброенага супрацьстаяння ў суседняй Украіне і іншых гарачых кропках», — сказаў беларускі лідар. Сведчаннем таму ён назваў беларускія ініцыятывы па пабудове роўнай і непадзельнай архітэктуры бяспекі, у тым ліку на еўразійскай прасторы, правядзенні ўсёабдымнага дыялогу ў духу Сан-Францыска.

Па традыцыі падобных цырымоній Прэзідэнт звярнуўся да кожнага кіраўніка дыпламатычнай місіі асобна і акрэсліў пытанні двухбаковага супрацоўніцтва.

БОСНІЯ І ГЕРЦАГАВІНА

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь адкрыта да кантактаў і разнапланавага ўзаемадзеяння з гэтай краінай. «Нягледзячы на штучныя знешнія бар'еры і нестабільную міжнародную абстаноўку, мы бачым магчымасці для развіцця сувязяў у сферах узаемнай цікавасці. У нас нямала пазітыўных прыкладаў супрацоўніцтва і сумесных напрацовак, асабліва ў сферы машынабудавання, сельскай гаспадаркі і аховы здароўя. Лічу, што наданне рэгулярнасці двухбаковым кантактам — дыпламатычным, дзелавым, рэгіянальным і парламенцкім — будзе садзейнічаць вызначэнню новых пунктаў судакранання і выхаду на новыя праекты», — сказаў ён.

У тэму

Двухбаковы рух — гэта вельмі важна

Сваімі планамі і задачамі на кадэнцыю замежныя дыпламаты падзяліліся з беларускімі журналістамі. **Гіоргі Саганелідзэ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Грузіі ў Беларусі,** прызнаўся, што Мінск ён любіць і яму вельмі падабаецца беларускі народ. «Ёсць узаемнае разуменне, што трэба збліжаць нашы народы, якія вельмі станоўча ставяцца адзін да аднаго. Нам трэба развіваць супрацоўніцтва. Час няпросты, адпаведна трэба знаходзіць пункты судакранання і развіваць нашы двухбаковыя адносіны ў тых кірунках, якія выгадныя нашым краінам. Думаю, што ўсё атрымаецца», — адзначыў пасол. Гіоргі Саганелідзэ падкрэсліў, што трэба вяртацца да высокага ўзроўню адносін (у тым ліку і палітычных) паміж Беларуссю і Грузіяй. «Галоўнае, каб у нашых краінах быў мір, а з астатнім мы справімся, — сказаў ён. — Мы адзначаем вялікае імкненне беларускага боку да аднаўлення нашых добрых адносін. Двухбаковы рух — гэта вельмі важна».

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Беларусі Мухамад Айджаз сказаў: «Першыя ўражанні аб краіне — самыя пазітыўныя. Добрая, сардэчная атмасфера і прыгажосць — такой я ўбачыў Беларусь». Па словах пасла, патэнцыял супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Пакістанам не вычарпаны. «Многае трэба зрабіць. І мы гатовы вывесці беларуска-пакістанскія кантакты на новы, больш высокі ўзровень. Беларусь — развітая краіна, з высокімі стандартамі ў сельскай гаспадарцы, што вельмі карысна для нашага супрацоўніцтва. Я разлічваю на ўмацаванне адносін паміж Беларуссю і Пакістанам», — адзначыў Мухамад Айджаз.

Дарэчы

Прэзідэнт Беларусі правёў тэлефонную размову з Прэзідэнтам Гвінеі-Бісау

Умару Сісоку Эмбала патэлефанаваў кіраўніку беларускай дзяржавы для абмеркавання актуальных пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва.

Адбылася грунтоўная размова па ўсім комплексе двухбаковых адносін, а таксама кірунках, па якіх бакі зацікаўлены развіваць узаемадзеянне, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка і Умару Сісоку Эмбала таксама абмеркавалі дэталі запланаванага афіцыйнага візіту лідара Гвінеі-Бісау ў Беларусь.

Адказваць за наладжванне сувязяў паміж Босніяй і Герцагавінай і Беларуссю цяпер будзе Іван Орліч.

БУРКІНА-ФАСО

Беларускі лідар звярнуў увагу, што Буркіна-Фасо цяпер перажывае важны перыяд у сваёй гісторыі. Па яго словах, у Беларусі гатовы падставіць плячо нашым сябрам у індустрыялізацыі розных сектараў эканомікі і павышэнні ўзроўню іх эфектыўнасці. «На нас вы можаце разлічваць. У роўнай ступені гэта адносіцца і да сфер адукацыі, аховы здароўя, высокіх тэхналогій, вырашэння выклікаў у пытаннях абароны і харчовай бяспекі. Прапаную папрацаваць над стварэннем каардынацыйных механізмаў у выглядзе сумеснай міжурадавай камісіі і савета дзелавога супрацоўніцтва», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка паслу Арыстыду Рапугдондбу Людовіку Тапсоба.

ГРУЗІЯ

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што ў Беларусі высока ацэньваюць і падтрымліваюць крокі Грузіі па адстойванні сваёй дзяржаўнасці і суверэнітэту. Гэта сугучна з нашымі падыходамі. «І вы павінны рабіць у Грузіі ўсё тое, што ў інтарэсах грузінскага народа. Традыцыі сяброўства і ўзаемнай павагі беларусаў і грузінаў, агульныя старонкі гісторыі з'яўляюцца трывалай асновай для аднаўлення паўнацэннага ўсебаковага супрацоўніцтва нашых краін. Вы добра ведаеце: нашы дзверы заўсёды для вас былі і ёсць адчынены. З Грузіяй у нас няма абсалютна ніякіх праблем», — сказаў Прэзідэнт. Узначальваць дыпламатычную місію гэтай краіны цяпер будзе Гіоргі Саганелідзэ.

ІНДЫЯ

Індыю Аляксандр Лукашэнка назваў не проста даўнім сябрам і партнёрам. Цяпер мы імкнёмся выйсці з гэтай краінай на стратэгічны ўзровень адносін. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што пры падтрымцы Нью-Дэлі ў 2024 годзе Мінск стаў паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і атрымаў статус краіны — партнёра БРІКС. «Мы вельмі ўдзячныя кіраўніцтву Індыі за гэта», — сказаў ён паслу Індыі ў Беларусі Ашоку Кумару.

КЕНІЯ

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь разглядае Кенію як апорны пункт ва Усходняй Афрыцы. Ён нагадаў, што падчас свайго візіту ў Кенію ў снежні 2023 года з прэзідэнтам Уільямам Руто былі дасягнуты дамоўленасці актывізаваць кантакты па шэрагу кірункаў, ключавым з якіх з'яўляецца забеспячэнне харчовай бяспекі Кеніі. «Беларускі бок гатовы да прадметнай работы з абноўленым складам урада вашай краіны. Чакаем Прэзідэнта Руто ў Мінску ў зручны для яго час», — запэўніў Прэзідэнт. Працаваць над рэалізацыяй дамоўленасцяў у Беларусі будзе Пітэр Мутуку Матукі.

ЛАОС

«Наша ўзаемадзеянне з Лаосам на міжнародных пляцоўках нязменна мае дружалюбны і канструктыўны характар. У найбліжэйшай перспектыве неабходна рэалізаваць дамоўленасці, дасягнутыя падчас маёй сустрэчы з Прэзідэнтам летась у Казані. Для гэтага з нашымі лаоскімі партнёрамі намечаны шэраг сумесных мерапрыемстваў», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да пасла Сіпхандона Ойбуабудзі.

МАЛАЙЗІЯ

Малайзію Прэзідэнт назваў перспектыўным партнёрам Беларусі ў Паўднёва-Усходняй Азіі. «У нашых краін вялікія, але пакуль не да канца скарыстаныя магчымасці для супрацоўніцтва ў сферах харчовай бяспекі, прамысловай кааперацыі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій», — заўважыў ён. Адказваць за трывалыя адносіны паміж Малайзіяй і Беларуссю цяпер будзе Лун-Лаі Чэонг. Беларусі лідар пажадаў Малайзіі паспяховага старшынства ў АСЕАН у 2025 годзе.

M'ЯНМА

«Бачу вялікія перспектывы для развіцця партнёрства з М'янмай. Некалькі дзён таму мы абмеркавалі ўвесь комплекс двухбаковых адносін са Старшынёй Дзяржаўнага адміністрацыйнага савета, Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Саюз М'янма Мін Аун Хлайнам падчас яго афіцыйнага візіту ў Беларусь», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Адным з адказных за рэалізацыю дамоўленасцяў будзе і пасол М'янмы ў Беларусі Ціта Лін Оўна.

ПАКІСТАН

«Мы высока цэнім Пакістан як надзейнага партнёра ў Паўднёвай Азіі і мусульманскім свеце. Вынікам майго нядаўняга візіту ў Ісламабад сталі дамоўленасці па многіх перспектыўных кірунках. Беларускі бок гатовы няўхільна выконваць усе ўзятыя на сябе абавязацельствы, цесна каардынуючы дзеянні з пакістанскім бокам», — падкрэсліў Прэзідэнт, звяртаючыся да пасла Пакістана ў Беларусі Мухамада Айджаза.

«ПАЦВЯРДЖАЮ ГАТОЎНАСЦЬ ДА АКТЫЎНАГА І ПЛЁННАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі заўсёды рады тым, хто настроены на прадукцыйную працу, бачыць у нас раўнапраўнага і перспектыўнага партнёра. «Яшчэ раз пацвярджаю гатоўнасць да актыўнага і плённага супрацоўніцтва з вашымі краінамі ва ўсіх сферах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. У сваю чаргу мы забяспечым спрыяльныя і камфортныя ўмовы для рэалізацыі вашых прапаноў і ідэй. Упэўнены, што ў якасці кіраўнікоў дыпламатычных місій вы прыкладзяце максімум намаганняў для надання прыкметнай дынамікі адносінам паміж нашымі краінамі», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён пажадаў дыпламатам паспяховай работы, здароўя і добрага настрою ў Беларусі.

«ЗЯМЛЯ ДАЛЁКАЯ, АЛЕ НАША»

Чым Далёкі Усход блізкі Беларусі

Другое мерапрыемства ў графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на аўторак таксама было прысвечана супрацоўніцтву на знешнім вектары. Толькі больш блізкім. Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з губернатарам Прыморскага краю Алегам КАЖАМЯКАМ.

«Павінен адзначыць, Алег Мікалаевіч, што вы — чалавек слова. Прыехалі ў Беларусь, прыехалі да Прэзідэнта — абмеркавалі пытанні. Можа, нешта новае прыдумаем з вамі ў нашым супрацоўніцтве. Пракантралюем, як выконваюцца старыя дамоўленасці», — прывітаў госця беларускі лідар. Прыморскі край, які шмат што звязвае з нашай краінай, Аляксандр Лукашэнка назваў зямлёй далёкай, але нашай. «Уладзівасток і Прымор'е ніколі не былі для нас чужымі», — дадаў ён.

У сваю чаргу Алег Кажамяка павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з нядаўнім перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта. «Гэта найвышэйшы давер, які аказаў беларускі народ, зыходзячы з вашай паслядоўнай работы, станоўчай дынамікі, якую дэманструе краіна на працягу многіх гадоў і ў эканамічнай, культурнай, сацыяльнай сферах. Вядома, для нас вельмі важная і ваша шматгранная дзейнасць у міжнародным плане, тыя крокі, якія накіраваны на ўмацаванне дружбы паміж нашымі народамі, паміж Расіяй і Рэспублікай Беларусь», — сказаў ён.

Алег Кажамяка неаднаразова наведваў Беларусь. Прыморскі край зацікаўлены ў прадукцыі беларускай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, наладжаны трывалыя гуманітарныя зносіны. Мэтамі гэтага візіту дэлегацыі рэгіёна сталі перагаворы наконт закупкі беларускай тэхнікі, супрацоўніцтва ў сферы АПК.

У тэму

Жыхары Прыморскага краю давяраюць беларускім таварам

Размаўляючы з журналістамі, Алег Кажамяка падкрэсліў, што кожны яго візіт адкрывае новую старонку ў супрацоўніцтве Беларусі і Прыморскага краю і іншымі рэгіёнамі Далёкага Усходу. «Мы бачым, наколькі важная такая інтэграцыя для жыхароў Прыморскага краю, дзе каля 30 % людзей мае беларускія карані, родзічаў у вашай краіне. І для нас вялікае значэнне маюць прыстойнасць беларускіх калег пры выкананні сваіх абавязацельстваў прадпрыемствамі, высокая якасць беларускай прадукцыі ў розных галінах. Для жыхароў Прыморскага краю беларускія тавары знаходзяцца ў прыярытэце, яны ім даверяюць. І таму расце тавараабарот: сёлета ён дасягае ўжо каля 26 мільярдаў рублёў з ростам 16 %, на 25 % вырас экспарт з Прыморскага краю», — сказаў Алег Кажамяка. Па яго словах, гэтыя паказчыкі будуць расці і далей.

Алег Кажамяка падкрэсліў, што Прыморскі край мае патрэбу ў камунальнай, дарожнай, пасажырскай тэхніцы. «Гэта вельмі цікавы кірунак, які паказвае перспектыву Мінскаму аўтамабільнаму заводу стварыць дэманстрацыйную пляцоўку з прэзентацыяй сваёй тэхнікі ў нас», — адзначыў губернатар Прыморскага краю. Зацікаўлены рэгіён і ў прадукцыі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, харчовых камбінатаў.

Паміж Прыморскім краем і Беларуссю наладжаны добрыя спартыўныя сувязі. Нашы юныя (ад 12 да 16 гадоў) спартсмены актыўна ўдзельнічаюць у спаборніцтвах «Дзеці Прымор'я», «Юнацтва Прымор'я». У 2026 годзе беларусы зноў выступяць на маштабных спаборніцтвах «Дзеці Прымор'я», дзе таксама будуць удзельнічаць спартсмены з Кітая і краін СНД.

Што да новых кірункаў супрацоўніцтва, то Алег Кажамяка вылучыў культурныя сувязі. Сёлета ў Мінску пройдзе фестываль «Балетнае лета» — артысты Прыморскага края разам з артыстамі Марыінскага тэатра прадэманструюць сваё майстэрства на беларускай сцэне.

Журналісты звярнулі ўвагу на тое, што сёлета Алег Кажамяка адзначае 20-годдзе сваёй губернатарскай дзейнасці. І сімвалічна, што ён сустракае гэту дату ў Беларусі, з чым Алег Кажамяка пагадзіўся. Ён адзначыў, што ўсе 20 гадоў, працуючы раней губернатарам Амурскай вобласці, Сахалінскай вобласці і цяпер Прыморскага краю, ён імкнуўся наладжваць супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі.

Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

«ВЫ СТАНОВІЦЕСЯ ГРАМАДЗЯНАМІ НАШАЙ КРАІНЫ, ЯКІЯ ЎЖО НЯСУЦЬ АДКАЗНАСЦЬ ЗА БУДУЧЫНЮ»

Наталля КАЧАНАВА ўручыла пашпарты юным беларусам

Урачыстая цырымонія ў рамках Усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», прымеркаванай да Дня Канстытуцыі, адбылася ў Савеце Рэспублікі. 14-гадовыя пераможцы алімпіяд, спаборніцтваў, конкурсаў, грамадскія актывісты з розных рэгіёнаў краіны атрымалі з рук Старшыні Савета Рэспублікі найважнейшы дакумент — пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Уручэнне пашпартоў моладзі з нагоды Дня Канстытуцыі Наталля Качанава назвала добрай традыцыяй. «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь — Асноўны Закон краіны, па якім жыве і развіваецца наша дзяржава, які вызначае нашу палітыку, сацыяльную накіраванасць», — адзначыла спікер.

Наталля Качанава нагадала, што ў 2022 годзе ў Беларусі быў праведзены рэспубліканскі рэферэндум па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Свой унёсак у распрацоўку гэтага найважнейшага дакумента зрабілі і заканадаўцы.

«У 2024 годзе мы адзначылі 30-годдзе Асноўнага Закона нашай краіны, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Канстытуцыя паказвае сталасць нашага грамадства, славутую гісторыю, якую наш народ у многім выпакутаваў. У год 80-годдзя Вялікай Перамогі мы разумеем, што павінны захаваць святую памяць аб тых людзях, якія цаной свайго жыцця адстаялі свабоду і незалежнасць нашай краіны». Гэтыя тэзісы, як дадала спікер, адлюстраваны і ў Асноўным Законе.

Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што кожны раз хвалюецца, калі ўручае маладым людзям пашпарты. «З трапятаннем бяру ўдзел у гэтай акцыі, бо разумею, наколькі для вас гэта важна, — удакладніла яна. — Для кожнага чалавека важна адчуваць значнасць і датычнасць да сваёй краіны. Сёння жыццё так склалася, што пашпарт можна мець з самага нараджэння. Але гэтую традыцыю (уручэнне пашпартоў маладым людзям па дасягненні 14-гадовага ўзросту. — **«Зв.»**) мы захоўваем, бо ўсялякі раз хочацца паглядзець на вас: як вы ўспрымаеце нашу краіну, ці любіце вы яе. Дакладна ведаю, што гэта так».

Наталля Качанава адрасавала маладым людзям пажаданні: «Найперш вы павінны любіць сваю краіну, ганарыцца ёй. Наша Беларусь гэта заслужыла. Вы павінны сябраваць. Сваімі адносінамі да краіны, навучання, бацькоў, школы, настаўнікаў вы павінны быць прыкладам для іншых хлопцаў і дзяўчат. І не проста прыкладам. Вы павінны падтрымліваць адно аднаго, падказваць адно аднаму. Ваша слова вельмі важнае для тых, хто побач з вамі. Таму ўмейце сябраваць, шанаваць сяброўства, а самае галоўнае — умейце шанаваць чалавека. Мы павінны любіць кожнага і адносіцца падобраму адно да аднаго».

«Атрымліваючы пашпарт, вы становіцеся грамадзянамі нашай краіны, якія ўжо нясуць адказнасць за будучыню, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы вельмі спадзяёмся, што тыя пакаленні моладзі, якія прыйдуць за намі, зробяць усё для таго, каб захаваць тыя традыцыі, што былі закладзены ў нашай краіне, і захаваюць Беларусь такой жа мірнай, прыгожай, дагледжанай».

У падарунак хлопцы і дзяўчаты атрымалі Дзяржаўны сцяг і Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, вокладку на пашпарт і кніжнае выданне «Сімвалы суверэннай Беларусі».

Сапраўдным грамадзянінам Рэспублікі Беларусь пасля атрымання пашпарта адчувае сябе і **вучань сярэдняй школы № 60 г. Гомеля Іван ЛУК'ЯНЕНКА.** «Мець гэты дакумент — вельмі вялікі гонар для мяне, — падзяліўся ён. — Я — жыхар гэтай краіны. І, як сапраўдны грамадзянін, магу ўдзельнічаць ва ўсіх справах дзяржавы».

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

НА КАНТРОЛІ

ЦІ СУПАДАЕ СТАТЫСТЫКА З РЭАЛІЯМІ?

Ігар СЕРГЯЕНКА здзейсніў рабочую паездку ў Віцебскую вобласць

Падчас паездкі Старшыня Палаты прадстаўнікоў наведаў прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу, азнаёміўся з гатоўнасцю машынна-трактарнага парка да веснавых палявых работ, а таксама са станам спраў у жывёлагадоўчай галіне, паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.

У паездцы Ігара Сергяенку суправаджалі прадстаўнікі Мінсельгасхарча, а таксама кіраўнікі Верхнядзвінскага і Мёрскага раёнаў.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў дэталёва азнаёміўся з тым, як прайшла ў гаспадарках зімоўка буйной рагатай жывёлы, як ідуць справы з арганізацыяй яе кармлення і ўтрымання, выкананнем ветэрынарна-санітарных правіл і тэхналагічнай дысцыпліны.

Наведаны прадпрыемствы ААТ «Любінава», УП «Чарэсы», ААТ «Узменскі край» Мёрскага раёна, міжраённы механізаваны атрад на базе ААТ «Верхнядзвінскі райаграсэрвіс», УВП «Вужыца-Агра», ААТ «Белькаўшчына», ААТ «Шайтэрава» Верхнядзвінскага.

У цэлым работа па падрыхтоўцы да пасяўной ідзе поўным ходам. Аднак у Мёрскім раёне кіраўніцтву гаспадарак выказаны шэраг заўваг па якасці ўтрымання буйной рагатай жывёлы, умовах захоўвання кармоў, гатоўнасці тэхнікі да веснавых палявых работ. Спецыялісты Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання акцэнтавалі ўвагу на неабходнасці больш строгага ўліку і ідэнтыфікацыі кароў, вядзення племянной работы, гарантавання эпідэмічнай бяспекі.

Сітуацыя ў Верхнядзвінскім раёне значна мяняецца ў лепшы бок. Утрыманне жывёлы адпавядае ветэрынарна-санітарным правілам. Тэхніка прыведзена ў гатоўнасць да палявога выхаду, статыстыка па яе спраўнасці супадае з рэаліямі.

Фота ТГ-канала Палаты прадстаўнікоў.

ВЫНІКІ І ВЫСНОВЫ

«ТРЭБА ЎМЕЦЬ СЛУХАЦЬ ЛЮДЗЕЙ, А ПЫТАННІ, ЯКІЯ ПАСТУПАЮЦЬ, — РАЗГЛЯДАЦЬ ЭФЕКТЫЎНА»

Падрабязнасці выязнога пашыранага пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі

Мерапрыемства ў такім фармаце па выніках адзінага дня прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі — традыцыйнае. Адзіны дзень прыёму грамадзян сенатарамі прайшоў 3 сакавіка ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці. Па кожным звароце даваліся канкрэтныя даручэнні, кожная праблема, якая хвалюе грамадзян, бралася на кантроль. «Такая форма работы намі праводзіцца ўжо не першы год, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — У Мінскай вобласці папярэдні раз мы праводзілі ў кастрычніку 2022 года, з таго часу зроблена вельмі шмат. Практычна ўсе задачы, запісаныя ў пратакол па выніках таго прыёму, выкананы».

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што работа з людзьмі для кожнага дзяржаўнага органа, прыёмы і сустрэчы з людзьмі вельмі важныя. «У гэтым годзе мы правялі выбары Прэзідэнта нашай краіны, народ нам аказаў вельмі сур'ёзны давер, — канстатавала спікер. — Аляксандр Лукашэнка на гэты конт выразна сказаў: народ нам даверыў краіну — і мы павінны апраўдаць гэты давер. А апраўдаць яго кожны з нас зможа, калі ўсе мы будзем вельмі актыўна працаваць і выконваць свае функцыянальныя абавязкі, задачы, якія стаяць перад кожным з нас. Як адзначыў сёння Прэзідэнт нашай краіны, прымаючы даверчыя граматы, мы пабудавалі дзяржаву для народа. А калі гэта дзяржава для народа — мы павінны ўмець слухаць людзей, пытанні, якія паступаюць да нас, разглядаць эфектыўна».

Работа са зваротамі грамадзян паказвае: ёсць пытанні, на якія трэба звярнуць увагу. «Гэта перш за ўсё паўторныя звароты, у тым ліку калектыўныя, — канкрэтызавала Наталля Качанава. — Акрамя таго, мы ўбачылі пытанні, якія датычацца выхаваўчага працэсу ў школах. Таксама нам, дэпутацкаму корпусу трэба звярнуць асаблівую ўвагу на органы мясцовага самакіравання. Перакананa: мы павінны пабываць усюды, у кожнай вёсцы, дайсці да кожнага чалавека. Там жывуць нашы людзі. Гэта наша ключавая задача».

Паводле БелТА.

З НАГОДЫ

ПАЧАТАК ВЯЛІКІХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

На 2025 год гранты Прэзідэнта Беларусі прызначаны 46 спецыялістам

У мінулым годзе гранты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь былі прызначаны 58 спецыялістам у галіне навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры і маладзёжнай палітыкі. Учора леташнія атрымальнікі грантаў давалі справаздачу аб выніках навуковых даследаванняў. Адначасова на пасяджэнні рэспубліканскай камісіі, якую ўзначаліў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір КАРАНІК, былі разгледжаны кандыдатуры, якія вылучаюцца на атрыманне грантаў кіраўніка дзяржавы ў бягучым годзе.

Фота БелТА.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Мерапрыемства прайшло ў Нацыянальнай акадэміі навук. На двух паверхах акадэміі размясцілася традыцыйная выстаўка, дзе былі прадстаўлены прэзентацыйныя справаздачы аб выніках навуковых даследаванняў, праектах у галіне адукацыі і маладзёжнай палітыкі. Віцэ-прэм'ер азнаёміўся з кожным стэндам, выслухаў кожнага спецыяліста. З боку Уладзіміра Караніка асноўным да іх было пытанне практычнай значнасці і эфектыўнасці даследаванняў, выкананых пры грантавай падтрымцы. Аналізуючы крыху пазней убачанае і пачутае на абароне праектаў, ён падкрэсліў: усё, што адбываецца ў рамках гэтай праграмы на працягу ўжо дзесяці гадоў, варта разглядаць самым сур'ёзным чынам, і адзначыў, што распрацоўка — гэта спроба, першы крок, за якім можа стаяць вялікая будучыня.

— Калі гэта датычыцца медыцыны, то вынік работы — выратаваныя чалавечыя жыцці, захаванае здароўе. Адукацыя — наша будучыня, таму што менавіта ад развіцця нацыі залежыць рух наперад, — сказаў віцэ-прэм'ер. — Калі мы не будзем удзяляць увагу навуцы, мы вельмі хутка акажамся неканкурэнтаздольнымі. Вядома, культура — гэта вельмі важна. Наступныя пакаленні павінны быць не толькі падрыхтаванымі тэхнічна, не толькі быць здаровымі, але і захаваць традыцыі, культурны код нашага народа. І не проста захаваць, а прымножыць і перадаць наступным пакаленням.

Як правіла, прэзідэнцкія гранты выдзяляюцца на даследаванні і распрацоўкі ў розных галінах: ад навукі да сучасных методык, вучэбна-метадычных комплексаў, электронных навучальных дапаможнікаў для павышэння якасці адукацыі навучэнцаў і студэнтаў. Ад стварэння новых метадаў і тэхналогій лячэння пацыентаў, дыягностыкі захворванняў да рэалізацыі творчых праектаў у музычным і тэатральным мастацтве, экспазіцый музеяў і выставак. Большасць праектаў ужо сёння ўкаранёны ў рэальным сектары эканомікі.

Асаблівая ўвага — маладзёжным праектам, мэта якіх — патрыятычнае выхаванне, вывучэнне гістарычнай спадчыны, уцягванне маладых у грамадскае жыццё і павышэнне грамадзянскай актыўнасці. Гэтым разам установы адукацыі прадставілі адразу некалькі цікавых і кранальных праектаў — інклюзіўны праект па стварэнні маштабных мадэляў помнікаў архітэктуры рэгіянальнага і нацыянальнага значэння пры дапамозе 3D-мадэлявання для людзей са слабым зрокам і «Яблыневы сад Перамогі» — гісторыя старога фруктовага саду, які аднавілі школьнікі і напоўнілі яго новым сэнсам і малымі архітэктурнымі формамі, кожная з якіх адлюстроўвае тэму Вялікай Перамогі. Не менш цікавы праект Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта — «Віртуальны музей маці», які прысвечаны традыцыйным сямейным каштоўнасцям, любові да матулі, роднай хаты, сваёй малой радзімы.

— У нашай краіне навука, сацыяльная сфера заўсёды знаходзяцца ў зоне пільнай увагі. Дадатковая ўвага з боку Прэзідэнта — выдзяленне грантаў па гэтых кірунках — дазваляе падтрымаць маладых таленавітых навукоўцаў і забяспечыць ім фінансаванне і адміністрацыйную падтрымку для ўкаранення распрацовак. Многія інавацыйныя распрацоўкі, выкананыя па грантах, я ўпэўнены, лягуць у аснову вялікіх праектаў, якія дазволяць нам заявіць пра сябе не толькі ў Беларусі, але і на сусветнай арэне. Гэта распрацоўкі ў галіне абароны касмічных апаратаў, сродкаў сувязі, для сістэмы аховы здароўя, павышэння эфектыўнасці аказання медыцынскай дапамогі і многія іншыя, — сказаў Уладзімір Каранік.

Алена ВІНАГРАДАВА.

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

РАЯЛЬ-«МАРАФОНЕЦ» — У ПАДАРУНАК

На інструменце, які аб'ехаў з удзельнікамі рэспубліканскай акцыі ўсю краіну, цяпер будуць іграць маладыя таленты

Шматлюдна, урачыста і творча, можна сказаць, адсвяткавалі новае месца прапіскі аднаго з двух раяляў, якія «вандравалі» і былі часткай галоўных канцэртаў «Час выбраў нас» на «Марафоне адзінства». Інструмент у падарунак ад Федэрацыі прафсаюзаў атрымаў Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М. І. Глінкі. Перадача адбылася ў Вялікай зале навучальнай установы з удзелам высокіх гасцей, выкладчыкаў і студэнтаў.

— Мне невыказна прыемна знаходзіцца ў Мінскім дзяржаўным музычным каледжы імя М. І. Глінкі, з якога выйшла шмат нашых легендарных музыкантаў і кампазітараў. Мне радасна, што ўжо сто гадоў вы годна перадаяце нашу музычную традыцыю наступным пакаленням цудоўных музыкантаў. Дзякуй вам за гэта і нізкі паклон. Вялікую ўдзячнасць я таксама хачу выказаць Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, бо дзякуючы іх дапамозе ў вашага каледжа ёсць цяпер такі цудоўны інструмент, — сказаў **міністр культуры Беларусі заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Руслан ЧАРНЕЦКІ.** — Інструмент ужо мае сваю ўнікальную гісторыю. Гэта раяль-«марафонец», які праехаў па ўсёй краіне з 17 верасня да 24 студзеня ў рамках акцыі «Марафон адзінства». Менавіта на ім была выканана ў тым ліку кампазіцыя «Славянскае сузор'е», якую музыканты добра ведаюць. Упэўнены, што гэты інструмент дапаможа і вашым студэнтам стаць майстрамі сваёй справы.

Другі раяль будзе перададзены ў Магілёўскі каледж мастацтваў. На раялях будуць вучыцца будучыя віртуозы фартэпіяннай музыкі. А ў тым выпадку, калі акцыя «Марафон адзінства» атрымае працяг, інструменты будуць чакаць новыя вандроўкі па Беларусі.

— Я ўпэўнены, што сённяшняя падзея таксама дасць старт і задасць добрую планку тым студэнтам, хто будзе іграць на гэтым інструменце, выступаючы на канцэртах, а таксама стане сімвалам імкнення да мэты і сімвалам адзінства, што сёння ўжо закладзена ў гэтым раялі, — адзначыў **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Аляксандр ШЧАКОВІЧ.** — І дазвольце мне ўсіх вас падзякаваць ад імя Федэрацыі прафсаюзаў за тое, што вы несяце культуру, прыгажосць і мастацтва, духоўнасць у людзі. Робіце гэта штодня, прымнажаючы прыгажосць і натхняючы іншых.

— Для каледжа вялікая радасць — пашыраць сваю матэрыяльна-тэхнічную базу. Гэта незаменны інструментарый, які дазваляе нам рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для сферы культуры нашай краіны. І сённяшні дзень знакавы, паколькі у нас з'явіўся першы раяль айчыннай вытворчасці і ён мае сваю слаўную гісторыю, — падзяліўся **дырэктар Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. І. Глінкі Аляксей СНІТКО.** — Мы ўпэўнены, што той энергетычны запал, які мае гэты інструмент, будзе натхняць на новыя дасягненні нашых адораных студэнтаў.

Фота БелТА.

Атрымліваць такія падарункі заўсёды прыемна. І Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М. І. Глінкі прымае яго ў год стагадовага юбілею, што па-свойму адметна і сімвалічна. Сёння ў навучальнай установе вучацца парадку 350 студэнтаў. Сюды прыходзяць па адукацыю са знакам якасці. А вось займацца на новым інструменце найперш будзе магчымасць у музыкантаў спецыяльнасці «Фартэпіяннае выкананне». Студэнтка 1 курса менавіта гэтай спецыяльнасці Анастасія Васюкевіч якраз апынулася ў ліку першых, хто змог на новым інструменце прадэманстраваць свой талент і здольнасці, выконваючы 24-ы Эцюд Шапэна. Перад выхадам на сцэну яна сказала:

— Сёння вельмі значны для мяне дзень, таму што іграць на новым інструменце, які падарылі нашаму каледжу, — гэта асаблівае задавальненне. Прыемна ўсведамляць, што да цябе на ім выконвалі музыку знакамітыя людзі, а цяпер такая магчымасць ёсць у нас — тых, хто толькі ступіў на шлях самастойнага прафесійнага навучання.

Алена ДРАПКО.

КОЖНАЯ ПАРА РУК — НА ВАГУ ЗОЛАТА

На наступным тыдні стартуе акцыя «Дай лесу новае жыццё!»

Акцыя пройдзе ў Беларусі з 21 сакавіка па 12 красавіка, паведамілі ў Мінлясгасе.

Кампанія, накіраваная на аднаўленне лясоў, у тым ліку пацярпелых у выніку разгулу ліпеньскай стыхіі, адбудзецца ўжо другі раз. У профільным міністэрстве нагадалі, што восенню мінулага года старт ініцыятыве даў асабіста Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, пасля чаго ініцыятыву падхапілі ўсе вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі міністэрстваў, камітэтаў, канцэрнаў і іншых ведамстваў.

— У рамках другога этапу акцыі ўпор пераважальна будзе зроблены на аднаўленні ветравальна-бураломных лесасек. Асноўны фронт работ трэба будзе выканаць у найбольш пацярпелай Гомельскай вобласці, дзе цяпер актыўна вядзецца падрыхтоўка глебы пад будучыя лесапасадкі, — растлумачылі ў Мінлясгасе.

Сімвалічна, што ў гэты раз акцыя пройдзе пад эгідай Года добраўпарадкавання і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Чакаецца, што кампанію, як і ў папярэднія гады, падтрымаюць дзясяткі тысяч валанцёраў.

Каб узяць удзел у акцыі, добраахвотнікам неабходна звязацца з лясгасам або лясніцтвам, і заявіць аб сваім жаданні. Лесагаспадарчыя ўстановы галіны забяспечаць валанцёраў неабходным інвентаром і пасадачным матэрыялам.

Лесапасадкі будуць арганізаваны па ўсёй краіне. Аднак Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае валанцёраў аказаць сваю дапамогу па магчымасці Гомельскай ці Магілёўскай вобласці, найбольш пацярпелым ад разгулу стыхіі. У гэтых абласцях кожная пара рук — на вагу золата, а ўнёсак добраахвотнікаў у аднаўленне лясоў будзе ўдвая каштоўны.

У ведамстве дадалі, што ў найбліжэйшы час на сайтах лесагаспадарчых устаноў з'явіцца ўся неабходная кантактная інфармацыя.

Сімвалічна, што цяперашняя ініцыятыва Мінлясгаса атрымае свой працяг. Услед за акцыяй «Дай лесу новае жыццё!» стартуе новая кампанія «Лес! Дабро! Парадак!», накіраваная на добраўпарадкаванне беларускіх лясоў. Яна стартуе 12 красавіка, у дзень завяршэння акцыі «Дай лесу новае жыццё!», і фінішуе 1 мая, у Свята працы. Такім чынам, у Год добраўпарадкавання Мінлясгас правядзе сапраўдны марафон з добраахвотных акцый.

НАДЗЕЙНАСЦЬ РАЗЛІКАЎ

Давер да беларускага рубля расце, яго роля ў эканоміцы ўзмацняецца. У гэтым перакананы намеснік міністра эканомікі Алена Балігатава, якая агучыла такую думку ў інтэрв'ю «Першаму інфармацыйнаму» тэлеканалу.

Як нагадала ў ходзе гутаркі з журналістам намеснік кіраўніка эканамічнага ведамства, навацыі Закона № 62-З «Аб спажывецкім крэдыце і спажывецкім мікразайме» закранаюць і інтарэсы фізічных асоб у арэндных адносінах, напрыклад пры набыцці аўто ў лізінг або пры здачы жылля.

— Аб'ектыўна далёка не ўсе грамадзяне здольныя доўгатэрмінова прагназаваць змяненне макраэканамічнай кан'юнктуры. Адпаведна, новыя «правілы гульні» закліканы ліквідаваць валютныя рызыкі, якія раней клаліся на нашых людзей, — патлумачыла яна, дадаўшы, што Мінэканомікі і ў далейшым плануе разглядаць кропкава, у якіх канкрэтна грамадзянска-прававых адносінах неабходна сыходзіць ад валютнага эквіваленту.

Адказваючы на пытанне аб тым, наколькі за апошнія гады вырас давер да нацыянальнай валюты, Алена Балігатава звярнула ўвагу на змяненне ашчаднай мадэлі насельніцтва:

— Мы бачым, што грамадзяне сталі больш схільныя зберагаць у беларускім рублі, растуць аб'ёмы доўгатэрміновых укладаў, і гэта пазітыўны трэнд. З макраэканамічнага пункту гледжання чым менш ступень валютызацыі эканомікі, тым вышэй устойлівасць нацыянальнай валюты да знешніх шокаў. Мы працягнем курс на девалютызацыю.

Алена Балігатава таксама адказала на пытанні аб перспектывах канчатковага сыходу ад валюты ва ўнутраных разліках, выкарыстанні вопыту пераадолення «валютнага бар'ера» нашых партнёраў па ЕАЭС з улікам інтарэсаў бізнесу.

ВЫПРАБАВАНЫЯ ПОЎНАЧЧУ

Сямнаццаць 90-тонных БелАЗаў адпраўлены на Далёкі Усход

Кар'ерныя самазвалы новай мадэлі БЕЛАЗ-7558Р узмацняюць парк тэхнікі буйнога горна-абагачальнага комплексу па здабычы каменнага вугалю ў Якуціі, расказалі на прадпрыемстве.

Так, першыя 90-тонныя БЕЛАЗы гэтай мадэлі выехалі на дарогі комплексу летам мінулага года і зарэкамендавалі сябе ў працы прадукцыйнай і надзейнай тэхнікай. У выніку для вырашэння задач па паэтапным павелічэнні аб'ёмаў здабычы вугалю спажывец папоўніў свой транспартны парк яшчэ 17 самазваламі БЕЛАЗ-7558Р.

— Машына мяккая, зручная ў кіраванні. Паломак не было, праводзім толькі прафілактычнае абслугоўванне, каб тэхніка служыла як мага даўжэй, — расказаў **Аляксандр ТАЛЧЫНАЧЫН, аператар 90-тоннага самазвала.**

Як удакладняе вытворца, самазвалы БЕЛАЗ серыі 7558 — праверэная кар'ерная тэхніка, якая вытрымлівае вялікія дынамічныя і статычныя нагрузкі, адрозніваецца прадукцыйнасцю, надзейнасцю, высокай манеўранасцю, выгодай у кіраванні, прастатой у эксплуатацыі і тэхабслугоўванні.

СТАЛІЧНЫЯ ВЫШЫНІ

З пачатку года ў Мінску ўвялі ў эксплуатацыю 46 тысяч «квадратаў» жылля. Колькі яшчэ будуюць і дзе, расказалі ў Мінгарвыканкаме.

У прыватнасці, для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадугледжана будаўніцтва 85 тысяч квадратных метраў жылля.

Акрамя таго, у сталіцы будуць і далей узводзіць і сацыяльнае, і арэнднае жыллё.

Старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Ірына Гонтарава распавяла, што ў Мінску будуюць таксама сацыяльныя аб'екты:

— У бягучым годзе плануем увесці ў эксплуатацыю дзве дзіцячыя дашкольныя ўстановы. Гэта дзіцячыя садкі ў пасёлку Усходні і ў раёне праспекта Незалежнасці — вуліцы Гурцьева. Таксама чакаецца здача прыбудовы да будынка 13-й гарадской паліклінікі і аб'екта аховы здароўя на вуліцы Маякоўскага, 31.

УЗАЕМНАЯ ЦІКАВАСЦЬ

Беларусь і М'янма маюць намер развіваць біржавы гандаль. Пра гэта паведамляе Беларуская ўніверсальная гандлёвая біржа. Мяркуецца, што выкарыстанне біржавога механізма спросціць працу кампаній з М'янмы на рынку Беларусі, а таксама забяспечыць празрыстасць цэнаўтварэння, кантроль выканання абавязацельстваў і дадатковыя інструменты страхавання рызык пры заключэнні экспартна-імпартных здзелак.

Пра гэта ішла размова падчас беларуска-м'янманскага бізнес-форуму, які прайшоў днямі ў Мінску з нагоды афіцыйнага візіту Старшыні Дзяржаўнага Адміністрацыйнага савета, Прэм'ер-міністра Рэспублікі Саюз М'янма Мін Аун Хлайна.

Распавядаючы аб найбольш перспектыўных сферах прымянення біржавай пляцоўкі, памочнік старшыні праўлення БУТБ Яраслаў Кавальчук акцэнтаваў увагу на сегменце АПК, які ўяўляе асаблівую цікавасць для м'янманскага бізнесу ў частцы закупак беларускай сельгаспрадукцыі, у першую чаргу сухога малака і кармавых дабавак.

СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА НАРАСТАЛЬНАЙ

Беларусь і Іран зацікаўлены ў развіцці пасажырскіх і грузавых авіяперавозак паміж краінамі

Перагаворы транспартных ведамстваў абедзвюх дзяржаў адбыліся ў Мінтрансе Беларусі.

Асноўная тэма сустрэчы — пашырэнне супрацоўніцтва ў галіне паветранага транспарту, паведамілі ў прэс-службе ведамства.

Беларускую дэлегацыю ўзначаліў намеснік міністра транспарту і камунікацый Сяргей Дубіна, іранскую — намеснік міністра дарог і гарадскога развіцця, прэзідэнт упраўлення грамадзянскай авіяцыі Ірана Хасейн Пурфарзанэ.

У сустрэчы таксама ўзяў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Іран у Беларусі Алірэза Санеі.

Як удакладнілі ў Мінтрансе, па выніках перагавораў падпісаны пратакол намераў. Бакі таксама дамовіліся правесці ўнутрыдзяржаўныя працэдуры, неабходныя для падпісання Пагаднення аб лётнай прыдатнасці.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
12 сакавіка 2025 г. № 9 (790)

ШТО І ПАЧЫМ?

Маніторым цэны і асартымент разам з дэпутатамі

Цэнавая сітуацыя ў рознічным гандлі заўсёды застаецца ў полі зроку дэпутатаў усіх узроўняў. Цяпер, на пачатку вясны, асабліва важнай выглядае даступнасць агародніны і фруктаў, якія вырошчваюцца ў нашай краіне.

Апошняе падкрэслівалася на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы 28 лютага. «Людзям павінна быць па кішэні самае простае: капуста, цыбуля, бульба, морква, яблыкі», — сказаў тады Прэзідэнт.

Карэспандэнты «Звязды» ў рэгіёнах разам з дэпутатамі вывучылі сітуацыю ў розных аб'ектах гандлю: ад супермаркета да аўтакрамы.

Старшыня Ельскага раённага Савета дэпутатаў Гомельскай вобласці Аксана ЗАХАРЧАНКА.

АГАРОДНІНА І ФРУКТЫ — ДАСТУПНЫЯ

Пра даступнасць прадуктаў, сацыяльную накіраванасць палітыкі гандлёвых сетак Брэста і Брэсцкага раёна на тыдні мы гаварылі з **дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Андрэем КРУПЕНЬКІНЫМ.** Нядаўна Андрэй Канстанцінавіч наведваў крамы райспажыўтаварыства ў Астрамечаве, гандлёвыя пункты фірмаў «Прадтавары» і «Санта» ў абласным цэнтры.

У краме аграгарадка Астрамечава адзначыў добры асартымент, наяўнасць тавараў ад розных вытворцаў. У гарадскіх крамах звярнуў увагу на даступнасць агародніны і фруктаў айчыннай вытворчасці. Паводле слоў дэпутата, рост цэн на асноўныя прадукты харчавання адбываецца ў адпаведнасці з інфляцыяй. Цана на сацыяльна значныя прадукты за месяц узрастае прыкладна на капейку-дзве, што сведчыць аб нізкім узроўні інфляцыі.

Узяць удзел у грамадскім маніторынгу цэн у магазіне прадпрыемства «Прадтавары» па вуліцы Валгаградскай абласнога цэнтра на запрашэнні карэспандэнта газеты згадзілася пастаянная пакупніца, пенсіянерка Таццяна Таміліна. Цэнавая сітуацыя на агародніну і фрукты выглядала так: бульба прапаноўвалася па цане 1,07 рубля за кілаграм, капуста — 1,24 рубля, цыбуля — 1,78 рубля, морква — 1,30 рубля. Яблыкі былі ў сетках з разліку 2,11 рубля за кілаграм, нефасаваныя каштавалі 3,83 рубля. Айчынныя агуркі прадаваліся па 6,33 рубля. Таматаў беларускай вытворчасці не было ў наяўнасці, самыя танныя расійскія прадаваліся па 11,56 рубля. Была зеляніна ад беларускіх вытворцаў, фасаваная па 50 грамаў, коштам ад паўтара да 1 рубля 85 капеек.

Дарэчы, і заморскія фрукты тут прапаноўвалі цалкам па дэмакратычнай цане: бананы каштавалі 6,59 за кілаграм, лімоны — 6,99. Таццяна Васільеўна падкрэсліла, што ўсё гэта прадаецца танней, чым, напрыклад, на суседнім рынку, за выключэннем, можа, памідораў. Яшчэ наш «народны эксперт» прывяла такія прыклады: свой любімы сыр яна купіла тут за 2,89 рубля, у крамах іншых сетак і іншых формаў уласнасці ён ужо даўно каштуе больш за 3 рублі. Як і яе любімае печыва, тут яна купляе яго па цане 1,29 рубля за пачак, а іншыя прапануюць больш чым за паўтара рубля. «Капейка да капейкі — для пенсіянера эканомія. Таму і выбіраю магазіны, якія не надта накручваюць цэны», — адзначыла Таццяна Таміліна. Варта падкрэсліць, што малако і малочныя прадукты ў краме прапаноўваліся на выбар не менш чым ад пяці вытворцаў. Быў адзначаны багаты асартымент мясных і каўбасных вырабаў.

Дэпутат Андрэй Крупенькін пагадзіўся з нашым экспертам у тым, што асноўныя агародніна і фрукты выглядаюць даступнымі для насельніцтва, як і іншыя прадукты сацыяльнай накіраванасці.

АД МАЛОЧКІ ДА «ГОРНІКА»

Старшыня Ельскага раённага Савета дэпутатаў Гомельскай вобласці Аксана ЗАХАРЧАНКА падчас нядаўняга маніторынгу цэн і асартыменту сацыяльна значных тавараў сельскіх гандлёвых аб'ектаў наведала крамы ў аграгарадку Кочышчы. Іх у населеным пункце дзве, адкрытыя індывідуальнымі прадпрымальнікамі. У аграгарадку пражывае 340 чалавек, пакупніцкі попыт тут даволі высокі.

Падчас маніторынгу крам дэпутат адзначыла, што забяспечаны асартымент сезоннай плодаагародніннай прадукцыі. Малочныя, мясныя вырабы — некалькімі вытворцамі, як і хлебабулачныя, якія вязуць як з Ельска, так і суседніх Нараўлянскага, Калінкавіцкага Лельчыцкага, Мазырскага раёнаў. Пакупнікі, якія любяць пэўныя маркі «малочкі» ці каўбас, ведаюць дні прывозу пэўных вытворцаў і прыходзяць спецыяльна закупіцца.

Па ўжо адпрацаваным алгарытме цэнавага кантролю дэпутат звярнула ўвагу на агародніну «для баршчу», яблыкі. Асаблівая ўвага і на цэны за кілаграм на сацыяльна значныя тавары ў рамках акрэсленых заканадаўствам меж.

— У маніторынгу нам дапамагае тое, што дэпутаты мясцовых Саветаў, кіраўнікі сельвыканкамаў, упаўнаважаныя старшынь па населеных пунктах — самі жыхары тых жа аграгарадкоў, вёсак фактычна маніторынг гандлёвых аб'ектаў праводзяць штодня, бачаць рэальна, як наладжана харчовае забеспячэнне, — зазначае Аксана Захарчанка.

Падчас маніторынгу гандлёвых аб'ектаў Кочышчаў Аксана Аляксееўна адзначыла даволі шырокі асартымент тавараў усіх груп — харчовых і прамысловых.

— Акрамя таго, тут вяскоўцы могуць заказаць буйнагабарытныя тавары: ад халадзільнікаў, пральных машын да будматэрыялаў. Асаблівым попытам карыстаюцца веласіпеды, прывозяць пад заказ нават «горнікі». Ніяк і без прылад для саду-агарода. Забяспечаны асартымент і касметычных тавараў. У адной з крам устанавілі кава-машыну, і вяскоўцы з радасцю прыходзяць, быццам у кавярню, кажуць, смачна, — расказвае дэпутат.

Для вяскоўцаў важна, што ў краме можна набыць і камбікорм для жывёлы. Так што мясцовыя пераважна ўвогуле не выязджаюць па пакупкі ў райцэнтр, яшчэ з горада людзі па дарозе не ўпускаюць магчымасці заехаць у Кочышчы па прысмакі.

АД ЦЫБУЛІ-СЕЯНКІ ДА СУВЕНІРАЎ

Уласны карэспандэнт «Звязды» па Віцебскай вобласці вывучала стан гандлёвых спраў разам са **старшынёй Лятчанскага сельскага Савета дэпутатаў Віцебскага раёна Аленай ПУЗЫРЭЎСКАЙ.**

Для маніторынгу былі абраны дзве крамы ў вёсцы Малыя Лётцы. Параўнаць асартымент і цэны, вядома, цікава як у прыватнай, так і ў краме райспажыўтаварыства. Апошняя, якая належыць Бешанковіцкаму райспажыўтаварыству, размясцілася побач з вядомым у краіне санаторыем «Лётцы».

Крама здзіўляе маленькімі памерамі і такім жа невялікім пералікам тавараў. На паліцы з садавіной і гароднінай адзінока ляжаць некалькі качаноў капусты па 1,25 за кіло, нядрэнная цыбуля па 1,80 за кілаграм. Бульбы выбар зусім невялікі, яблыкаў на паліцы не засталося ўвогуле, але цэннік сведчыць, што іх можна набыць па 3,46. «А заўсёды такія перабоі з гароднінай і садавіной?» — пытаюся я ў прадаўца. «Свежы завоз у аўторак і пятніцу, выбар будзе, проста пакуль усё скончылася», — бойка адказвае жанчына.

«Такая невялічкая крама разлічана больш на наведвальнікаў і работнікаў санаторыя. Мясцовыя ж ахвотней абіраюць прыватную краму «Зорка» — там не толькі даволі шырокі асартымент прадуктаў, але і зручнае месцазнаходжанне», — расказвае старшыня Лятчанскага Савета дэпутатаў.

Прыватная «Зорка» знаходзіцца каля дарогі, непадалёку ад чыгуначнай станцыі і насупраць другой здраўніцы паўночнага рэгіёна — санаторыя «Чыгуначнік». Звяртаем адразу ўвагу на халадзільнік з садавіной і гароднінай: бананы прапаноўваюць па 7,84, лімоны — па 6,97, памідоры — па 10,85, апельсіны можна набыць па 5,84 за кіло, пекінская капуста — па 7,36. Агуркі, пэўна, да нашага прыходу скончыліся. Здзівіла, што ні бульбы, ні буракоў, ні морквы на вітрыне не знайшлося.

Аднак даволі шырокі выбар мясной прадукцыі: каўбаса вараная і сыравэнджаная (па 23,71 рубля і 26,32 рубля за кіло), сардэлькі па 9,96 — адным словам, цана не адрозніваецца ад гарадской. На паліцы з печывам можна знайсці розныя найменні ад 9 да 15 рублёў за кілаграм, цукеркі на вагу і ў падарункавых каробках. Макаронныя вырабы ў шырокім асартыменце, хлебабулачныя вырабы — таксама, але пад канец дня ўжо выбіраць не даводзіцца. Малочная прадукцыя прадстаўлена некалькімі вытворцамі, прыемна здзівіла разнастайнасць газіраваных напояў: ад папулярных замежных да беларускіх, не менш смачных. Так, напрыклад, двухлітровая бутэлька газіраванага напою з рознымі смакамі магілёўскай вытворчасці каштуе ўсяго 1,58.

У аддзеле з прамысловымі таварамі можна знайсці ўсё неабходнае ад садовых тавараў да сувеніраў. Так, з наступленнем вясны ў продажы з'явіліся ўгнаенні, торф у пакетах, пластыкавыя вёдры і прылады для работы на зямлі. Цыбуля-сеянка — асабліва папулярны цяпер тавар — прапаноўваецца па 10,38 за кілаграм... Ёсць вітрына з сувенірнай прадукцыяй (у санаторыях адпачываюць і замежныя госці). Там можна знайсці габелены з беларускімі краявідамі, саламяныя кошыкі, магніты з гліны і нават тканыя дарожкі-ходнікі за 45 рублёў.

«Па выніках маніторынгу можна адзначыць, што цэны на сацыяльна значныя тавары трымаюцца на адэкватным узроўні. Чаго нельга знайсці ў адной краме, можна адшукаць у іншай, дэфіцыту тавараў не назіраецца», — заключыла Алена Пузырэўская.

А ЯК У АЎТАКРАМЕ?

Не застаюцца па-за ўвагай народных выбраннікаў і крамы на колах: для жыхароў невялікіх вёсак яны часта адзіны пастаўшчык неабходных тавараў. Так, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алег ДЗЯЧЭНКА** нядаўна назіраў за работай аўтакрамы ў Дрычынскім сельсавеце Асіповіцкага раёна Магілёўшчыны.

Аўтакрама прыватная, прыязджае сюды з Бабруйска. Дэпутат прызнаецца: парадавала разнастайнасць тавараў. Аднаго хлеба налічыў некалькі відаў.

— Пагутарыў з прадаўцом і быў прыемна ўражаны, што ўладальніца аўтакрамы спецыяльна вывучае попыт сярод насельніцтва і папаўняе асартымент у адпаведнасці з ім, — канстатуе Алег Дзячэнка. — Вітаміннай прадукцыі таксама хапае, але мінус у тым, што мала гародніны айчыннай вытворчасці. У асноўным толькі цыбуля беларуская...

Старшыня Асіповіцкага райсавета Уладзімір РЫЖАНКОЎ адзначае, што за аснову для кантролю цэн і асартыменту ў аўтакрамах бярэцца інфармацыя аддзела гандлю райвыканкама. Ён дае графікі руху крам на колах па часе і па даце.

— І мы дакладна ведаем, дзе і калі чакаць аўтакраму ў тым ці іншым населеным пункце. Напрыклад, у 10.00 яна павінна быць у вёсцы Вялікі Бор, і старшыня сельсавета загадзя туды пад'язджае — сёння ўсе яны забяспечаны транспартам — і вывучае прадукцыю і цэны.

У цэнтры ўвагі дэпутатаў — тавары з асноўнага спажывецкага кошыка: малочныя і мясныя прадукты, хлебабулачныя вырабы, яйкі, гародніна, садавіна... Цэны параўноўваюцца паміж рознымі пастаўшчыкамі, што і адлюстроўваецца ў справаздачы. Старшыня райсавета потым пераадрасоўвае гэтую інфармацыю ў аддзел гандлю для аналізу. Разам з фота, якія дасылаюць яму дэпутаты.

— Калі ёсць нейкія адхіленні ў цане на прадукты, разбіраемся, — удакладняе старшыня райсавета. — Але выпадкаў, калі сур'ёзна завышаліся б цэны, не было.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Наталля КАПРЫЛЕНКА,
Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390
Продавец	УП «Лаздуны-Агро», Гродненская обл., Ивьевский р-н, Лаздунский с/с, аг. Лаздуны 1, ул. Советская, д. 1. УНП 592001055
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by)

Предмет электронных торгов: бывшие в употреблении тракторы

Лот, №	Марка, модель	Начальная цена с НДС, бел. руб.
1	**Трактор «Беларус 82.1», СК-4 6023, 2011 г. в.**	**17 089,92**
2	**Трактор «Беларус 82.1», СК-4 6040, 2006 г. в.**	**15 840,80**
3	**Трактор «Беларус 922.3», СВ-4 8002, 2012 г. в.**	**20 081,43**
4	**Трактор «Беларус 1221В», СК-4 6016, 2006 г. в.**	**21 868,84**

Шаг торгов – 5 % от текущей цены лота

Месторасположение – Гродненская обл., Ивьевский р-н: лоты №№ 1, 2 – Ивьевский с/с, 21/1, в районе г. Ивье, лоты №№ 3, 4 – Эйгердовский с/с, 3, в районе д. Токаришки

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона
Условия оплаты предмета электронных торгов	100 % от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение 10 рабочих дней даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение 6 % от итоговой цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 15.04.2025.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by
Продавец	ООО «Оршавторпласт», 211031, Витебская обл., Оршанский р-н, д. Понизовье, д. 1-А. УНП 390530240

Предмет электронных торгов
Объекты недвижимого имущества в количестве 11 ед., общ. пл. 6059,6 кв. м, реализуемые одним лотом, по адресу: **Витебская обл., Оршанский р-н, Бабиничский с/с, д. Понизовье, 1 А.**
Обременения: договоры аренды

Сведения о земельном участке: общ. пл. 10,0185 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания строений и сооружений.
Состав имущества размещен на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

Начальная цена – 189 000,00 долл. США*. Расчет по договору купли-продажи будет производиться в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату проведения платежа

Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 30 (тридцать) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете Звязда от 25.01.2025 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.04.2025 г. с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **10.04.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

«ДЭПУТАТЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ ІНІЦЫЯТАРАМІ СУБОТНІКАЎ НЕПАСРЭДНА НА СВАІХ ТЭРЫТОРЫЯХ»

На выніковым пасяджэнні Мінскага гарвыканкама па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця сталіцы з удзелам Старшыні Савета Рэспублікі, упаўнаважаным прадстаўніком кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску Наталлі Качанавай, акрамя важных эканамічных паказчыкаў (чытайце мінулыя нумары «Звязды»), уздымалася і тэма добраўпарадкавання. Мы пацікавіліся асаблівасцямі добраўпарадкавання беларускай сталіцы ў «тэматычным» годзе і ўдзелам у ім дэпутатаў Мінгарсавета.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА адзначыла, што дэпутацкі корпус сталіцы павінен актыўна ўключыцца ў работу па добраўпарадкаванні горада. Звяртаючыся да старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, яна заявіла: «Дэпутаты павінны стаць ініцыятарамі ў плане навядзення парадку і працаваць з людзьмі ў гэтым кірунку, прыцягваць людзей да работ па навядзенні парадку на зямлі...»

Мы высветлілі, якім чынам дэпутаты будуць далучацца да такой работы. Як паведаміў **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН**, план па добраўпарадкаванні горада ўжо быў разгледжаны і зацверджаны на пазачарговай сесіі Мінгарсавета: «У гэтым плане былі абагульнены абсалютна ўсе кірункі, пачынаючы ад аб'ёмаў капрамонту і заканчваючы арганізацыяй суботнікаў на тэрыторыі кожнай акругі. Мы дамовіліся з дэпутатамі, што не менш чым два суботнікі будуць арганізаваныя нашымі тэрытарыяльнымі акруговымі саветамі. У ТАСы ўваходзяць, як правіла, прадстаўнікі грамадскасці, якая пражывае на пэўнай тэрыторыі, а таксама прадстаўнікі буйных прадпрыемстваў і арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі акруговага Савета. Мы рэтранслюем гэту задачу абсалютна ўсім, хто так ці інакш уплывае на тую ці іншую акругу або можа паўплываць сваім удзелам».

Старшыня Мінгарсавета ўдакладніў, што гэтыя суботнікі будуць праводзіцца ў рамках месячніка па добраўпарадкаванні. Ён дадаў, што перш за ўсё ўвага будзе аддавацца дваровым і зялёным тэрыторыям, бо ў горадзе гэты праект ужо рэалізоўваецца не адзін год: «Ініцыятыва зыходзіла ад кіраўніцтва Мінгарвыканкама, гэта — не менш чым дзве азелянёныя тэрыторыі на раён. Мы таксама ўключымся ў работу з грамадскасцю, каб можна было пашырыць рамкі тых планаў, якія зацверджаны па гэтых тэрыторыях менавіта за кошт насельніцтва. Другі немалаважны аспект — гэта самі дваровыя тэрыторыі, клумбы, кветнікі — усё тое, за чым так ці інакш людзі самі даглядаюць без удзелу камунальных служб. У камунальнай службы ёсць свае выразныя планы, свая тэрыторыя, якую яны павінны прывесці ў парадак. Таму тут мы ініцыятыўна будзем прапаноўваць людзям уладкаваць гэтыя ўчасткі».

Арцём Цуран звярнуў увагу на практычную рэалізацыю грамадзянскіх ініцыятыў. «Мы ўжо падыходзім да практычнай рэалізацыі. Гэта тыя 14 праектаў, якія перамаглі ў конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў. Акрамя іх, у нас больш за 30 ініцыятыў, што таксама можна рэалізоўваць, але ўжо без прымянення Закона аб мясцовым самакіраванні, якім прадугледжваюцца розныя падыходы. Таму мы дамаўляліся з кіраўнікамі адміністрацый, што яны па максімуме разгледзяць магчымасць уключэння ў планы добраўпарадкавання менавіта тых аб'ектаў, якія былі прадметам грамадзянскіх ініцыятыў па паляпшэнні той ці іншай тэрыторыі, па абнаўленні таго ці іншага аб'екта, каб сумесна з людзьмі іх і рэалізоўваць. Калі не паўнавартасна, то хоць бы часткова тэрыторыя будзе прывядзена ў парадак. Астатняе тады будзем дарабляць у наступным годзе. Пры гэтым ставім задачы не чакаць наступнага года, паступлення нейкіх дадатковых сродкаў на рэалізацыю гэтых грамадзянскіх ініцыятыў, а за кошт наяўных сродкаў іх ужо рэалізоўваць сёлета».

Дэпутацкі корпус сталіцы ўдзельнічае ў кожным суботніку, альбо сумесна з прадстаўнікамі Мінскага гарвыканкама, альбо самастойна прыводзяць у парадак пэўныя ўчасткі. «Вядома, мы будуем такія планы, але большы акцэнт сёлета хочам зрабіць менавіта на акруговыя Саветы, гэта значыць — на работу непасрэдна ў акругах. Гэта менавіта тое, пра што казала Наталля Іванаўна Качанава: дэпутаты павінны стаць ініцыятарамі суботнікаў непасрэдна на сваіх тэрыторыях. Яны, можа, і не будуць такімі маштабнымі, але, прынамсі, будуць накіраваныя на тую тэрыторыю, дзе выбіралі нашага дэпутата і дзе ён непасрэдна працуе са сваімі жыхарамі-выбаршчыкамі».

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Дарэчы

Кветкі, пляжы, дарогі і лесвіцы — важны комплексны падыход

Намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Алег КОРЗУН расказаў аб планах добраўпарадкавання сталіцы на гэты год.

Так, да 1 мая з прыцягненнем суб'ектаў неабходна выканаць комплекснае кветкавае афармленне, азеляненне, у тым ліку з выкарыстаннем малых архітэктурных форм, уваходных груп і, што немалаважна, замацаваных за прадпрыемствамі і арганізацыямі тэрыторый. Усяго на тэрыторыі горада ў 2025 годзе запланавана высадзіць 11 мільёнаў кветак. Напярэдадні васьмідзесяцігоддзя Вялікай Перамогі з удзелам працоўных калектываў і арганізацый з прыцягненнем моладзі да 1 мая будзе наведзены парадак на тэрыторыях мемарыяльных комплексаў і воінскіх пахаванняў.

Традыцыйна будзе выканана добраўпарадкаванне зон адпачынку ў кожным раёне горада Мінска ў тэрмін да 3 ліпеня і 13 верасня бягучага года. Дарэчы, іх цяпер 63, дадасца яшчэ 18.

Да 1 лістапада будзе завершаны рамонт усіх лесвіц, размешчаных на прыдамавых тэрыторыях і землях агульнага карыстання. Будзе працягнута работа па зносе эксплуатаваных будынкаў на тэрыторыі горада.

«У бягучым годзе будзе акцэнтавана ўвага на якаснае паляпшэнне тэрыторыі жылой забудовы. У 2025-м работы па добраўпарадкаванні будуць праведзены на 1033 такіх тэрыторыях. З іх на 209 будзе праведзена комплекснае добраўпарадкаванне (не менш за пяць відаў работ). Сёлета будзе ўстаноўлена і адрамантавана 780 кантэйнерных пляцовак, прычым большая ўвага аддаецца рамонту існых месцаў складзіравання адходаў, а ўстаноўцы сучасных модульных кантэйнерных пляцовак.

У 2025 годзе ў сталіцы запланавана адрамантаваць 1 мільён 82 тысячы квадратных метраў жылой плошчы. На правядзенне рамонту запланавана 432 мільёны рублёў. Асаблівая ўвага аддаецца комплекснаму падыходу пры планаванні капітальнага рамонту, а менавіта правядзенню капітальнага рамонту групы жылых дамоў, размешчаных у адным квартале на адной вуліцы з добраўпарадкаваннем дваровых тэрыторый».

Па планах на 2025 год прадугледжаны бягучы рамонт вулічна-дарожнай сеткі ў аб'ёме два мільёны 230 тысяч квадратных метраў. Сярод рэгіёнаў горад Мінск — лідар па аб'ёмах рамонту вулічна-дарожнай сеткі.

«Паказчыкі па выкананні планаў па добраўпарадкаванні горада на 2025 год даведзены да выканаўцаў. Фінансаванне забяспечана ў поўным аб'ёме, — адзначыў Алег Корзун. — Толькі разам мы зможам навесці парадак і яго падтрымліваць. Год добраўпарадкавання закліканы аб'яднаць намаганні дзяржавы і грамадства па далейшым паляпшэнні якасці жыцця ў нашай краіне».

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

ЯК СПРАВЫ НА МЕСЦАХ?

На мінулым тыдні сенатары актыўна працавалі ў рэгіёнах

• Член Савета Рэспублікі, галоўны ўрач Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр КАРПІЦКІ правёў асабісты прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію ў Хаціслаўскім сельскім Савеце Маларыцкага раёна. Ад мясцовых жыхароў паступілі пытанні, якія датычацца выкарыстання чэкаў «Жыллё», даплаты да пенсіі ўдзельнікам ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС, а таксама арганізацыі медыцынскай дапамогі жыхарам раёна.

У актавай зале СУП «Хаціслаўскі» адбылася сустрэча парламентарыя з жыхарамі сельсавета. Аляксандр Карпіцкі расказаў прысутным аб поспехах, якія дасягнуты ў развіцці аховы здароўя Брэсцкай вобласці, адказаў на пытанні, што хвалююць вяскоўцаў.

• Член Савета Рэспублікі, начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МЯЛЕШКІН правёў сустрэчу з працоўным калектывам прадпрыемства «БелФудпрадакшн» у Віцебскім раёне.

Кампанія «БелФудпрадакшн» — малады і актыўны ігрок на рынку харчовых прадуктаў для дзяцей. Менавіта таму Сяргей Мялешкін пачаў сустрэчу з асвятлення эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў Беларусі і ў блізкім замежжы. Ён адзначыў, што дружалюбная Беларусь заўсёды гатова да партнёрскіх адносін з усімі краінамі свету.

«Прадукты беларускай вытворчасці славяцца сваёй якасцю далёка за межамі краін блізкага замежжа. Якасць прадукцыі пацверджана часам, а дзелавая рэпутацыя Беларусі і яе прадпрыемстваў ужо стала нашай візітнай карткай», — падкрэсліў Сяргей Мялешкін.

У пяцігодку якасці парламентарый спыніўся на адказнасці пры выкананні сваіх службовых абавязкаў, бо ацэнка ўсяго калектыву залежыць ад якасці выкананых работ кожным з яго ўдзельнікаў.

• Член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа» Ала СМАЛЯК працавала ў Брагінскім раёне. У Брагіне яна правяла асабісты прыём грамадзян, а таксама вывучыла асартымент і цэнавы дыяпазон на тавары ў гандлёвым аб'екце «Родны кут». У цэнтры ўвагі парламентарыя ў тым ліку наяўнасць агародніны, яблыкаў перш за ўсё айчыннай вытворчасці, а таксама якасць рэалізаванай прадукцыі.

Ала Смаляк пабывала ў ААТ «Брагінка». Сенатар на ферме гаспадаркі азнаёмілася з умовамі працы, бытавымі ўмовамі, павіншавала працаўніц сельгаспрадпрыемства са святам 8 Сакавіка, падзякаваўшы ім за няпростую, але такую важную ў справе забеспячэння харчовай бяспекі працу.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

«ВАЖНА НЕ ПАДЛАШЧВАЦЦА ДА ЛЮДЗЕЙ, А РАСКАЗВАЦЬ РЭАЛЬНУЮ СІТУАЦЫЮ»

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Аксана ІЛЬКОВІЧ расказвае пра галоўныя аспекты работы ў сваёй 69-й Салігорскай сельскай акрузе

Дэпутат прызнаецца, што са сваёй выбарчай акругай, у склад якой уваходзяць горад Любань, Любанскі раён, увесь Салігорскі раён і частка новабудоўляў горада шахцёраў, знаёмілася практычна на працягу ўсяго свайго жыцця. Сама яна родам з вёскі Заельнае Любанскага раёна. Па спецыяльнасці педагог-дэфектолаг, 20 гадоў працавала ў Любані ў Цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, пасля — дырэктарам ТЦСАН. «Амаль усё сваё жыццё працавала з сацыяльна ўразлівымі катэгорыямі грамадзян. Гэта і сем'і з дзецьмі-інвалідамі, і пажылыя грамадзяне, таму пра патрэбы і праблемы людзей добра ведаю» , — гаворыць Аксана Ільковіч. Дарэчы, з Салігорскім раёнам яе звязвае і тое, што сын пасля заканчэння Акадэміі МУС працаваў там участковым.

Насельніцтва акругі налічвае крыху больш за 66 тысяч чалавек, і гэта вельмі шырокая тэрыторыя. І дэпутату падчас працы на месцы часта даводзіцца пераадольваць па 200 кіламетраў, імкнучыся наведаць самыя крайнія пункты гэтага вялікага рэгіёна.

— З чым прыходзяць на асабістыя прыёмы вашы выбаршчыкі?

— Не толькі з праблемамі. Грамадзяне прыходзяць і са сваімі просьбамі, і з прапановамі. Мяне заўсёды кранае, калі выбаршчыкі на прыёмах кажуць, што любяць свой населены пункт, калі кажуць дзякуй дзяржаве за тое, што робіцца для народа.

Што датычыцца спраў надзённых, напэўна, самая важная і запатрабаваная тэма, якая ўздымаецца сёння на вёсцы, — электрыфікацыя населеных пунктаў. Тут важна данесці да людзей, што з часам усе будуць забяспечаны электраэнергіяй, але зрабіць гэта за адзін раз немагчыма. І на Салігоршчыне, і на Любаншчыне грамадзяне, у якіх ужо праведзены газ, параўноўваюць пэўныя паслугі па газіфікацыі і энергазабеспячэнні і разумеюць, што электраацяпленне — гэта выгадна, танней, прасцей. Такія пытанні падымаюцца практычна на кожным прыёме грамадзян. Акрамя таго, атрымліваю звароты, якія датычацца жыццядзейнасці і жыццезабеспячэння людзей, пытанні выплаты сацыяльных ільгот і гарантый для самых розных катэгорый грамадзян. Сацыяльныя пытанні заўсёды былі і застаюцца самымі надзённымі. Вядома, усе ўмеюць чытаць, сёння пра многае інфармуюць, але часта людзі прыходзяць і просяць проста патлумачыць пэўную заканадаўчую норму; расказаць, як яна дзейнічае і гэтак далей. Я ўвесь час кажу, што вельмі важна не падманваць, не падлашчвацца да людзей, а заўсёды расказваць рэальную сітуацыю, тлумачыць выбаршчыкам, што рэальна можна зрабіць у іх бядзе, а што ідзе ўразрэз з заканадаўствам.

— Нярэдка вы праводзіце сустрэчы з моладдзю. Якія пытанні ўзнімаеце падчас такіх мерапрыемстваў? Што імкняцеся данесці ў першую чаргу?

— Ужо сёння мы актыўна далучаем моладзь да работы са зваротамі грамадзян, запрашаем на прыёмы, на сустрэчы з працоўнымі калектывамі. Добры таму прыклад — член Маладзёжнага парламента з Любанскага раёна Уладзіслаў Емельянчык. Здавалася б, звычайны настаўнік гісторыі і грамадазнаўства, які працуе ў сярэдняй школе № 3 Любані. Але ён практычна ў кожны мой прыезд удзельнічае ў сустрэчах з моладдзю, працоўнымі калектывамі і гэтак далей. У дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў мы разам з вучнямі старэйшых класаў і воінамі-«афганцамі» правялі жывы дыялог, дзе расказвалі аб той вайне; імкнуліся данесці, што мір на нашай зямлі абавязкова трэба зберагчы і захаваць. Гэта было даволі кранальна, хвалююча... І вельмі радуе, што сёння наша моладзь сапраўды нас чуе і разумее.

У цэлым у сваёй рабоце стараюся часцей праводзіць розныя форумы, сустрэчы, дыялогавыя пляцоўкі з нашай моладдзю. Не так даўно мы правялі форум з моладдзю сельгасарганізацый Любаншчыны і Салігоршчыны. Там працуюць цікавыя, таленавітыя маладыя людзі, і, што важна, яны не хочуць з'язджаць, яны хочуць жыць і развівацца ў невялікіх сельскіх населеных пунктах. Гэта наша будучыня. Як ні круці, Беларусь — сельскагаспадарчая краіна. Для нас важнае актыўнае развіццё сучаснай сельскай гаспадаркі. А хто зробіць яе сучаснай, калі не наша таленавітая моладзь?

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота з архіва Аксаны ІЛЬКОВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2
Продавец	ОАО «Оранчицкая птицефабрика», Брестская обл., Пружанский р-н, д. Оранчицы, ул. Трудовая, д. 125, УНП 200026018
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by)

Предмет электронных торгов

Грузовой самосвал МАЗ 555142 4227 РБ, АЕ5578, 2006 г. в.
Местонахождение:
Брестская область, д Оранчицы, ул. Трудовая, 125.
Начальная цена с НДС 20 % – 15 000,00 бел. руб.
(снижена на 20 %)
Шаг аукциона: **5 %** от текущей цены

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: 100 % оплата стоимости в течение **14 (четырнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, размещенном во вкладке «Документы». Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение 6 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.01.2025

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 31.03.2025 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.03.2025 до 17.00
на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**+375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by
Продавец	ОАО «БЕЛАЗ-СЕРВИС», 222160, Минская обл., г. Жодино, ул. Брестская, 31, тел. +375 177558884

Предмет электронных торгов (б/у), расположенный по адресу: Минская область, г. Жодино, Минская обл., ул. Брестская, 31	**Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.**
Грузовой пикап VOLKSWAGEN AMAROK DELIVERY, 2012 г. в., рег. № АК 9308-5, № кузова WV1ZZZ2HZCA034323	**47 628,00**

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.04.2025 г. с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок:
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **11.04.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Предмет аукциона	Начальная цена, руб. (без НДС)	Размер задатка, руб.
Лот № 1: легковой специальный седан ВАЗ 21074, год выпуска 2004 г., кузов № XTA21074052055424, регистрационный знак 0015 АЕ-1	699,06	69,91

Местонахождение объекта: г. Брест, ул. Северная, 13/1. **Продавец:** Государственное учреждение «Брестская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений», 224001, г. Брест, ул. Северная, 13/1, тел./факс 80162542059. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 28 марта 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 27 марта 2025 г. до 17.00

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 24.03.2025.

Лот № 1:
Помещение универсама с инв. № 200/D-168410,
площадь – 1935,9 кв. м.
Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Правды, 64А-1.
Земельный участок № 240100000001006088, 0,4013 га.
Право постоянного пользования.
Обременения: Аренда, Ипотека, Сервитут.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.
Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 1 897 375,48 доллара США.
Задаток – 607 805,26 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **19.03.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by
УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 24.03.2025.

Лот № 1:
Сооружение (инв. №: 500/C-1005851),
площадь – 1718 кв. м.
Адрес: г. Минск, пр-т Победителей, д. 49.
Земельный участок № 500000000007009184, 0,1718 га.
Право временного пользования земельным участком с 23.03.2021 по 31.01.2031.

Начальная цена с НДС 20 % – 36 860,00 доллара США.
Задаток – 11 807,73 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **19.03.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by
УНП 190055182

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

ПАРАДАК НА ДЗЕБРЫ

Як старшыня мікразоны ў Магілёве вырашае праблемы на Падгорнай

Нягледзячы на тое што мікразоны Падгорная і Падміколле — гэта цэнтр старадаўняга Магілёва, дабрацца сюды няпроста. Знаходзяцца яны ў маляўнічай нізіне, а з горадам іх злучаюць, лічы, адна дарога і восем лесвіц. Жыве тут амаль дзве тысячы чалавек, забудова выключна прыватная, можна сказаць: вёска ў горадзе. І падтрымліваць тут парадак без актывістаў было б складана. На шчасце, яны тут ёсць. І ахвотна дзеляцца сакрэтамі добраўпарадкавання. Вельмі актуальная ў такі год тэма.

СКЛАДАНЫ АБ'ЕКТ

Дзебра — невялічкая рачулка, якая раздзяляе вуліцу Катоўскага. Паабапал яе стаяць прыватныя дамы, праходзяць дзве аўтамабільныя дарогі. Падчас вялікіх дажджоў рэчка паказвае характар і здольная паднімацца на даволі вялікую вышыню — адным словам, зона небяспечная. Тэма добраўпарадкавання гэтай тэрыторыі вырашалася 15 гадоў. Работы то прыпыняліся, то зноў працягваліся. **Старшыня мікразоны Аляксандр ПІКУЛЯ** рэгулярна напамінаў гарадскім уладам пра праблемы. Неаднаразова з яго ж падачы тэма ўздымалася на старонках нашай газеты. Таму званок з Падгорнай, які апавясціў, што ўсё вырашана і зроблена, успрыняўся як нагода для радасці. Карэспандэнт «МС» адразу ж паспяшаўся на месца, каб на свае вочы пераканацца. Цяпер можна з поўнай адказнасцю сказаць, што кропка пастаўлена. Берагі ракі ўмацаваныя, дарогі заасфальтаваныя, зроблена прыгожая зона адпачынку, пастаўлены, а галоўнае — пачалі функцыянаваць, ліхтары, нарэшце з'явілася агароджа ўздоўж рэчкі.

— Усё пачалося ў 2010 годзе, — нагадвае Аляксандр Пікуля, як няпроста рабілася справа. — Паўгода ўмацоўвалі берагі Дзебры — было зроблена па 350 метраў з кожнага боку, але пасля першай жа вялікай паводкі пліты рухнулі. Будаўнікі вярнулі іх на месца, але напэўна, не замацавалі як трэба, і тыя доўга не пратрымаліся.

Надзейна ўмацаваць адхілы атрымалася толькі ў 2014 годзе, пасля звароту да Пятра Рудніка, які на той час быў старшынёй аблвыканкама. Але справы па добраўпарадкаванні на тым і прыпыніліся з-за недахопу фінансавання.

Калі старшынёй аблвыканкама стаў Леанід Заяц, Аляксандр Пікуля адразу ж запісаўся да яго на прыём з просьбай, каб заасфальтавалі дарогі ўздоўж рэчкі. Работы былі хутка зроблены. Пра агароджу жыхары працягвалі марыць. Адкрытым заставалася пытанне і па падключэнні 22 светлавых апор, бо адсутнічаў кабель. Значны прагрэс адбыўся летась.

ХАДЖЭННЕ ПА ПРАБЛЕМАХ

Пакуль праходжваліся з Аляксандрам Пікулем уздоўж Дзебры, ён некалькі разоў прыпыняўся пагутарыць з мінакамі. Алена, якая жыве ў гэтай мікразоне, вельмі задаволеная, што нарэшце тэрыторыя стала прыгожай і бяспечнай.

— Агароджа ўздоўж ракі — гэта, безумоўна, плюс, — кажа яна. — Тут і дзеці гуляюць, і машыны ездзяць. Усякае можа здарыцца.

— На сёння ў нас пражываюць 260 дзяцей да 14 гадоў, — удакладняе Аляксандр Пікуля. — Пазалетась, калі агароджы яшчэ не было, падлетак на веласіпедзе не ўпісаўся ў паварот і апынуўся ў рачулцы.

Ідзём далей, а Пікуля падрабязна расказвае, якія работы былі зроблены і хто канкрэтна імі займаўся. Два гады таму, літаральна на другі дзень пасля прыёму ў былога памочніка Прэзідэнта — інспектара па Магілёўскай вобласці Леаніда Мартынюка запрацавалі ліхтары, якія 11 гадоў стаялі як непрыкаяныя.

— А вунь, бачыце, які добры масток нам зрабілі, — хваліць ён дарожна-маставое прадпрыемства. — Людзі, якія ў царкву на богаслужэнні ходзяць, пахадайнічалі.

Летась Аляксандр Пікуля пабываў на прыёме ў начальніка галоўнага ўпраўлення ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама Таццяны Касаткінай. І дзве магілёўскія камунальныя арганізацыі — ДМП і спецаўтапрадпрыемства — за тры тыдні паставілі некалькі сотняў метраў агароджы. На гэтым ў справе па добраўпарадкаванні тэрыторыі вакол Дзебры была пастаўлена тлустая кропка.

ЯШЧЭ Б ЛЕСВІЦЫ...

— Сёлета нашаму вулічнаму камітэту будзе 21 год, — з гонарам кажа Аляксандр Пікуля. — І калі б не наш камітэт, добраўпарадкаванне Дзебры магло расцягнуцца на нявызначаны час. Мы ўвесь час нагадвалі пра сябе, не давалі справе заглухнуць. Кожны тыдзень робім абход мікразоны — глядзім, каб не было праблем з асвятленнем, з парадкам на дарогах, з рухам грамадскага транспарту.

Яшчэ актывісты падрыхтавалі калектыўны ліст па замене драўляных лесвіц на металічныя ў Рачным завулку і ў раёне моста па вуліцы Каралёва. Прагнозы — аптымістычныя.

— Нам ужо паведамілі, што сёлета плануецца іх замяніць, — дзеліцца прыемнай навіной Аляксандр Пікуля. — Яшчэ ёсць пытанні па жалезабетонай лесвіцы — каля моста па вуліцы Каралёва. Ёй 30 гадоў, і ні разу яшчэ не было рамонту.

— Пытанні вырашаем адначасова на ўсіх узроўнях, — кажа старшыня мікразоны. — Акрамя маніторынгу, вядзём яшчэ і перапіску з рознымі інстанцыямі. За два месяцы 12 адказаў атрымалі. Гэта дапамагае кантраляваць тэрміны выканання, бо там адказныя асобы свае подпісы ставяць. Жыхары падтрымліваюць голасам і нават рублём. Не ўсё ж за конт дзяржаўных грошай можна вырашыць.

КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ПАДВОРАК

Тэма добраўпарадкавання для мікразоны актуальная заўсёды. Людзі зацікаўлены, каб каля іх дамоў было прыгожа. Адна сям'я нават музей стварыла ў народных традыцыях. Існуе конкурс на лепшае добраўпарадкаванне, які праводзіцца ў жніўні. Асабліва ўдзячны старшыня мікразоны дэпутату гарсавета, першаму прарэктару БРУ Юрыю Машыну, які часта бывае ў сваёй выбарчай акрузе. Апошнім разам дапамог растыражаваць новы расклад руху аўтобуса № 39.

Пад канец Аляксандр Пікуля не ўпускае выпадку прарэкламаваць мясцовую краму.

Як толькі туды заходзім, пакупнікі адразу ж ажыўляюцца. Кожны жадае сказаць добрае слова пра свайго актывіста.

— Наш Пікуля незаменны, старавец, — удакладняе прадавец. — Калі б не ён, жылі б тут як у балоце. Колькі ў нас машыны ўвальваліся ў гэтую Дзебру, людзі падалі. А наш старшыня дабіўся, каб агароджу паставілі. Малайчына.

— Ды яму за яго старанні медаль трэба даць, — дадае мужчына з чаргі. — Такіх, як ён, яшчэ трэба пашукаць. З ім любыя праблемы можна вырашыць. Так і напішыце ў газеце.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11 291. Нумар падпісаны ў 19.30 11 сакавіка 2025 года.

СТАРТАВАЛА СВЯТА КНІГІ

ТЭМАТЫЧНЫЯ ДНІ

Так, у рамках Дня Рэспублікі Казахстан пройдуць прэзентацыя культурнага і турыстычнага патэнцыялу Казахстана, вялікая літаратурная сустрэча «Казахстан — Беларусь: мерыдыяны дружбы», у рамках якой прадставяць кнігу Лайлы Ахметавай «1941. Брэсцкая крэпасць. Казахстан». Таксама прагучаць вершы на казахскай і казахскіх аўтараў у перакладзе на рускую і беларускую мовы.

13 сакавіка Пасольства Кыргызскай Рэспублікі сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі правядзе вялікую прэзентацыю, прысвечаную творчасці Чынгіза Айтматава, сумесным выдавецкім праектам.

14 сакавіка, у Дзень Расіі, запланавана шырокая праграма не толькі на расійскім стэндзе, але і на галоўнай сцэне кірмашу, дзе пройдуць выступленні творчых калектываў, музыкантаў і паэтаў з рэгіёнаў Расіі: Башкартастана, Дагестана, Татарстана і Чачні. Таксама на галоўнай сцэне пройдуць сустрэчы з пісьменнікамі — рэзідэнтамі «кніжнага цягніка» — вялікага праекта, які аб'ядноўвае гарады і краіны.

Наступны дзень — Дзень Рэспублікі Беларусь, падчас якога пройдуць прэзентацыі найбольш знакавых выдавецкіх праектаў: «Сімвалы суверэннай Беларусі», «Суперпазіцыя. Паралельныя светы», сустрэча з народным пісьменнікам Беларусі Мікалаем Чаргінцом, урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў 64-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А ў апошні дзень выстаўкі, 16 сакавіка, фальклорны ансамбль «Эрэбуні» прэзентуе культурны патэнцыял Арменіі.

СІМПОЗІУМ МАЙСТРОЎ СЛОВА

Насычаную праграму па традыцыі прадставіць Саюз пісьменнікаў Беларусі сумесна з беларускімі выдавецтвамі, ілюстратарамі, творчымі калектывамі. Традыцыйна пісьменнікаў, прадстаўнікоў выдавецкіх колаў, творчай інтэлігенцыі, індустрыі друку краін — удзельніц выстаўкі збярэ Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». Сёлета тэмай форуму, які пройдзе 12 сакавіка, стане «Культура і інфармацыя як кірункі развіцця гуманітарнай прасторы».

«ЗВЯЗДА» ПРАПАНУЕ

Як распавяла намеснік дырэктара РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Святлана Ганцарэвіч, наведвальнікі нашага стэнда змогуць пазнаёміцца з кніжнымі навінкамі і набыць самую разнастайную літаратуру.

На галоўным стэндзе запланаваны прэзентацыі кніг Мікалая Чаргінца, Аляксандра Радзькова, Валерыі Сцяцко, Людмілы Гладкай, Алесі Кузняцовай. На дзіцячай пляцоўцы з удзелам аўтараў пройдуць прэзентацыі кніг Людмілы Кебіч, Таццяны Сучковай, Іны Фраловай, Тамары Кавальчук і іншых.

Яшчэ на стэндзе выдавецтва пройдуць аўтограф-сесіі з удзелам дзіцячай пісьменніцы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой, прэзентацыі і аўтограф-сесія Рагнеда Малахоўскага, Валянціны Быстрымовіч, Ганны Альхоўскай, Сяргея Клімковіча, Віктара Шніпа і Людмілы Рублеўскай.

Вядома, не абыдзецца і без акцый. Так, у рамках выстаўкі ўсе ахвотныя змогуць набыць кнігі па даступнай цане, паўдзельнічаць у віктарыне, прысвечанай 80-годдзю Перамогі, і ў бясплатным латарэі, а пасля атрымаць памятныя прызы і сувеніры.

Дарэчы

Арганізатары забяспечылі курсіраванне паэтычнага аўтобуса, што дазволіць усім ахвотным бясплатна даехаць да месца правядзення выстаўкі і падчас паездкі пагутарыць з прадстаўнікамі творчых літаратурных колаў, пачуць дэкламацыю твораў паэтаў і празаікаў.

Маршрут № 935 працуе з 12 да 16 сакавіка з 10.00 да 19.00. Аўтобус будзе адпраўляцца ад Палаца спорту і накіроўвацца да месца правядзення выстаўкі. Інтэрвал руху — кожныя 15 хвілін.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by
Продавец	ООО «БелПродРеал», 211023, Витебская область, г. Орша, ул. Строителей, д. 13. УНП 391423449
Предмет электронных торгов Объекты недвижимого имущества в количестве 8 ед., общ. пл. 2415 кв. м, реализуемые одним лотом, по адресу: **Витебская обл., г. Орша, ул. Строителей, 13.** ***Обременения:*** договоры аренды	
Сведения о земельном участке: общ. пл. 1,8445 га предоставлен продавцу под производственную базу на праве аренды по 09.07.2097. Состав имущества размещен на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)	
Начальная цена – 162 000,00 долл. США*. Расчет по договору купли-продажи будет производиться в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату проведения платежа	
Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных дней со дня завершения электронных торгов	
Срок оплаты предмета электронных торгов: 30 (тридцать) календарных дней после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия	
Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете Звязда от 25.01.2025 г.	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.04.2025 г. с 11.00 до 13.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **10.04.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by	
Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

СКАЖЫЦЕ, ДОКТАР...

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД СЕЗОННЫХ ГІПАВІТАМІНОЗАЎ?

Вітаміны — незвычайныя рэчывы, без якіх нармальнае функцыянаванне арганізма немагчыма. Нездарма адзін з даследчыкаў гэтых цудоўных злучэнняў Казімір Функ даў ім найменне Vitamine ад лацінскага vita — «жыццё». Нягледзячы на тое што вядомыя яны нам з дзяцінства і само слова «вітаміны» ўвесь час на слыху, усё яшчэ існуюць міфы адносна гэтых біяхімічных памочнікаў арганізма. Некаторыя людзі лічаць, што могуць выдатна абыходзіцца і без іх, а іншыя, наадварот, рэгулярна і з лішкам ужываюць іх без разбору і ў вялікіх колькасцях. Развейваем міфы і высвятляем праўду разам з участковым урачом-педыятрам 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Ірынай СЯМЁНАВАЙ.

Міф 1. Вітамінаў дастаткова ў ежы, таму ўжываць іх дадаткова няма сэнсу

Збольшага гэта так, лічыць урач. Вітаміны ўтрымліваюцца ў садавіне і агародніне, мясе і рыбе, бо менавіта з ежай мы павінны атрымліваць гэтыя важныя рэчывы. Аднак сучаснае культываванне агародніны і садавіны вымушае жадаць лепшага, шматлікія плодаагародніннyя культуры збіраюць недаспелымі, што, несумненна, уплывае на якасць прадуктаў. Акрамя таго, каб насычаць арганізм усімі вітамінамі ў належных колькасцях, неабходныя разнастайны рацыён харчавання, захаванне культуры харчавання, чаго пры сучасным рытме жыцця дасягнуць даволі складана. Ну і, нарэшце, не ўсе прадукты даступныя ўвесь год. Напрыклад, менавіта ў вясновы перыяд мы адчуваем сімптомы недахопу вітамінаў, бо ўзімку спажыванне садавіны і агародніны рэзка абмежавана, рацыён адносна бедны.

Міф 2. Вітаміны ў таблетках горш. Лепш есці натуральныя прадукты

І зноў жа сітуацыя дваякая. З аднаго боку, у прадуктах сапраўды змяшчаюцца вітаміны ў дастатковых дозах. Напрыклад, 100 грамаў ківі пакрываюць сутачную патрэбу ў вітаміне С, гэта значыць больш чым на 250 %. А ў 100 грамах цяляціны змяшчаецца ў сярэднім 1,7 мкг вітаміну B_{12}, што складае 68,8 % ад сутачнай патрэбы. Аднак калі ківі вы можаце з'есці без якой-небудзь апрацоўкі, то цяляціну ў сырым выглядзе будуць ужываць у ежу толькі асобныя гурманы.

— Кабаламін, або вітамін B_{12}, не выносіць тэрмічнай апрацоўкі больш за 120 °С, а ў мясе з-за змяненняў, якія адбываюцца на клетачным узроўні, ён пачынае разбурацца яшчэ на стадыі захоўвання, — звяртае ўвагу Ірына Сямёнава.

І такая ж сітуацыя са шматлікімі вітамінамі. Нават самы просты вітамін С, хоць і цалкам знішчаецца толькі пры 190 градусах, губляе свае ўласцівасці за кошт актыўнага акіслення малекул ужо пры 50 градусах, а значыць, папоўніць дэфіцыт вітаміну С зімой духмяным варэннем не атрымаецца.

Міф 3. Каб зімой не адчуваць патрэбы ў вітамінах, трэба «наесціся» імі ўлетку і ўвосень

На жаль, назапасіцца вітамінамі таксама не атрымаецца. Яны не адкладваюцца ў арганізме ў запас, а вось празмернасць некаторых можа прывесці да гіпервітамінозу. У той жа час дасягнуць гэтага стану ўжываннем звычайных прадуктаў даволі складана, бо ў ежы іх змяшчаецца зусім невялікая колькасць. Сачыце за тым, каб вітаміны паступалі ў ваш арганізм штодзень і ў строгай адпаведнасці з дозамі, якія рэкамендуюцца, і нормамі харчавання.

Міф 4. Вітаміны лечаць хваробы

Зусім не! Вітаміны дапамагаюць пазбегнуць развіцця некаторых хваравітых станаў. А вось недахоп якога-небудзь вітаміну сам па сабе можа з'яўляцца прычынай захворвання. Напрыклад, дэфіцыт у рацыёне вітаміну D можа прывесці да дэпрэсіі і атлусцення. А недахоп вітаміну B_6 змяняе правядзенне нервовага імпульсу, выклікае сутаргі, узмацняе раздражняльнасць і нервовасць. У той жа час для лячэння захворванняў вітаміны неэфектыўныя. Напрыклад, вітамін С насуперак устойліваму меркаванню не лечыць «прастуду», ён паляпшае ўсмоктванне жалеза, нейтралізуе таксіны ў клетках печані, а таксама ўдзельнічае ва ўмацаванні сасудзістай сценкі. Натуральна, пры недахопе гэтага каштоўнага вітаміну арганізм будзе аслаблены і не гатовы супрацьстаяць інфекцыям.

Алена КРАВЕЦ.

«НАША ЗАДАЧА – РАБІЦЬ СВАЮ

ПРАВЕРЫЦЬ, ПРААНАЛІЗАВАЦЬ, УДАСКАНАЛІЦЬ

«Калі я чую выразы, што мы палохаем кагосьці сваімі праверкамі, паганяем, гэта не выклікае нічога, акрамя пачуцця іроніі і смеху, – заявіў **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН.** – На жаль, становішча вакол нашай краіны нельга назваць міралюбным. І, ацэньваючы так абстаноўку, мы абапіраемся на факты. У суседніх з намі дзяржавах колькасць мерапрыемстваў баявой падрыхтоўкі вырасла ў дзясяткі разоў.

Сёння войскі НАТА знаходзяцца паблізу ад нашых дзяржаўных граніц. Мы бачым комплекс мерапрыемстваў па падрыхтоўцы інфраструктуры: дарог, партоў, узмацненне мастоў. Мы фіксуем пастаяннае вядзенне разведкі супраць нашай дзяржавы. Гэтыя факты, якія гавораць самі за сябе, паказваюць, хто насамрэч каму пагражае. І тая рыторыка, якая сёння гучыць ад заходніх палітыкаў, носіць адпаведны характар. Маскі ўжо цалкам скінуты».

Міністр абароны адзначыў, што правядзенне такіх праверак – даўняя практыка: «Тут, напэўна, не трэба быць вялікім ваенным аналітыкам. Гэта ўжо даўно адпрацаваная ў нас практыка, якую мы праводзім з году ў год. Асноўная мэта – праверыць існуючую сістэму падрыхтоўкі нашых войскаў. Мы разумеем, што такія праверкі – найбольш эфектыўная форма падрыхтоўкі войскаў, таму што мы можам не толькі праверыць ці кантраляваць узровень боегатоўнасці, але і прааналізаваць, а таксама своечасова і хутка ўнесці адпаведныя змяненні ў тыя сістэмы, якія сёння патрабуюць удакладнення».

Ці фінальная гэта кропка праверкі боегатоўнасці? Паводле слоў кіраўніка ведамства, не. Гэта ўсяго толькі завяршальны этап аднаго са злучэнняў Узброеных Сіл, якое правяраецца: «Мэта маёй работы на палігоне сёння – праверыць, як арганізавана камандна-штабное вучэнне, як апрацоўваюцца перш за ўсё пытанні кіравання, здольнасць камандзіраў кіраваць на павялічаных дыстанцыях з наяўнымі сродкамі кіравання ў нашых Узброеных Сілах. Пракантраляваць, як арганізаваны пытанні ўсебаковага забеспячэння, наколькі ўкаранёны новыя формы і спосабы прымянення розных узораў узбраення, такіх як беспілотныя лятальныя апараты, сродкі радыёэлектроннай барацьбы».

«НЕ ТРЭБА ДУМАЦЬ, ШТО ВОРАГ ПРЫЙДЗЕ, А ТРЭБА ДУМАЦЬ, З ЧЫМ ЯГО СУСТРЭНЕМ»

Журналісты сталі сведкамі завяршальнага эпізоду вядзення баявых дзеянняў адным з падраздзяленняў. Яно прайшло дагэтуль сур'ёзную падрыхтоўку, пачынаючы ад прызыву «на зборы» каля пяці тысяч ваеннаабавязаных, зняцця тэхнікі з захоўвання, аднаўлення навыкаў, здзяйснення маршаў на палігон, прычым на незнаёмую мясцовасць. Віктар Хрэнін дадаў, што пакуль рана падводзіць нейкія вынікі, таму што трэба будзе ўсё сур'ёзна прааналізаваць: «Адно магу сказаць дакладна: нашым людзям можна сказаць дзякуй. Бачым, наколькі высока яны падрыхтаваныя і наколькі праяўляюць жаданне быць датычнымі да абароны. Яны дэманструюць гэта не на словах, а на справе».

Віктар Хрэнін адзначыў, што інфармацыя пра Беларусь часта наўмысна скажаецца, каб дэзынфармаваць насельніцтва той ці іншай краіны: «Свежы таму прыклад – зусім нядаўна абвясцілі, што будзем праводзіць на тэрыторыі Беларусі з Узброенымі Сіламі Расіі вучэнне «Захад-2025». Яшчэ ідзе работа над выпрацоўкай задумы гэтага вучэння, а яно ўжо абрасло такімі небыліцамі... Мы выдатна разумеем, з якой мэтай гэта робіцца. Мы будзем кіравацца прынцыпам: «Не трэба думаць, што вораг не прыйдзе, а трэба думаць, з чым мы яго сустрэнем». Наша задача – рабіць сваю справу, каб нашы людзі адчувалі абароненасць, бяспеку. Калі для таго, каб на тэрыторыі нашай краіны не было баявых дзеянняў, спатрэбіцца знаходзіцца на палігонах і дзень, і ноч – мы так і будзем рабіць».

«КОЖНЫ МУЖЧЫНА ПАВІНЕН УМЕЦЬ АБАРАНЯЦЬ СВАЮ РАДЗІМУ»

Перад пачаткам тактычных дзеянняў удалося пагутарыць з некаторымі ваеннаабавязанымі. Зараджаныя і мэтанакіраваныя, яны выдатна гатовыя да выка-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению **Добрушского РайПО** (продавец) извещает о проведении **25 марта 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества **в** 12.00 по адресу: **г. Гомель, ул. Жарковского, д.** 24, **каб.** 3-2

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 311/С-52032 общей площадью 152,9 кв. м, наименование – магазин № 8, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321280801601000033 площадью 0,0858 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, п. Красный Алес; капитальное строение с инв. № 311/С-51817 общей площадью 85,8 кв. м, наименование – магазин, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321286401601000022 площадью 0,0579 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Переростовский с/с, п. Лебедевка, магазин № 12. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 2 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 6 075,00 бел. руб. **Задаток** – 60,75 бел. руб.

Лот № 2. Капитальное строение с инв. № 311/С-52039 общей площадью 768,1 кв. м, наименование – магазин № 17, магазин № 9, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – двухэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: тремя крыльцами, гаражом, погребом, уборной, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321284006601000213 площадью 0,4407 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Крупецкий с/с, аг. Крупец, ул. Советская, магазин № 17, магазин № 9. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 17 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 25 443,60 бел. руб. **Задаток** – 254,44 бел. руб.

Лот № 3. Капитальное строение с инв. № 311/С-50123 общей площадью 1646,1 кв. м, наименование – магазин № 12 «Стройматериалы», назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – А1/кп-Основное строение, Б1/кп-Пристройка, 1-Навес с рампой, 2-Склад, а-Рампа, б-Навес, е-Ворота, и-Калитка, в-Покрытие, к-Ограждение, ж-Ворота, г-Ворота, д-Ворота, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100002000397 площадью 0,6386 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Первомайская, 87

Начальная цена продажи без НДС – 190 800,00 бел. руб. **Задаток** – 1 908,00 бел. руб.

Лот № 4. Капитальное строение с инв. № 311/С-52706 общей площадью 260,4 кв. м, наименование – столовая, назначение – здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности – сарай, уборная, 4 крыльца, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321286403101000001 площадью 0,1770 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Переростовский с/с, аг. Переерост, пер. Центральный, 6. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 27 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 10 512,00 бел. руб. **Задаток** – 105,12 бел. руб.

Лот № 5. Капитальное строение с инв. № 311/С-51810 общей площадью 389,9 кв. м, наименование – склад солей, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности – одноэтажный кирпичный склад, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100002000394 площадью 0,1091 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Торговая, склад солей

Начальная цена продажи без НДС – 17 520,00 бел. руб. **Задаток** – 175,20 бел. руб.

Лот № 6. Капитальное строение с инв. № 311/С-50660 общей площадью 676 кв. м, наименование – магазин № 52, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное, состоящее из кирпича и железобетонных панелей, здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321283201601000117 площадью 0,1379 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Круговец-Калининский с/с, аг. Круговец-Калинино, ул. Ленина В. И. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 12 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 36 051,00 бел. руб. **Задаток** – 360,51 бел. руб.

Лот № 7. Капитальное строение с инв. № 311/С-52028 общей площадью 119 кв. м, наименование – магазин № 15, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное с тамбуром и крыльцом здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321286801601000124 площадью 0,0390 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Усохо-Будский с/с, д. Усохская Буда, ул. Садовая. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 13 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 6 727,50 бел. руб. **Задаток** – 67,28 бел. руб.

Лот № 8. Капитальное строение с инв. № 311/С-52015 общей площадью 184,6 кв. м, наименование – магазин № 3, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное с двумя крыльцами здание магазина, с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321275702601000088 площадью 0,0425 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, д. Нивки, магазин № 3. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 10 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 9 108,00 бел. руб. **Задаток** – 91,08 бел. руб.

Продавец: Добрушское РайПО, г. п. Тереховка, ул. Советская, 30.
Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 44 590-84-01.
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.
Для участия в аукционе необходимо:
1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB301213 22650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.
Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24.03.2025 г. в 17.00.
Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**
Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи не позднее **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу не позднее **10 (десяти) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).
Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62

СПРАВУ»

нання задач па прызначэнні, нават нягледзячы на тое, што тэрміновая служба ў арміі засталася, здавалася б, далёка ў мінулым. «Задачы сёння ў нас стаяць простыя — адбіць накат праціўніка, — расказвае **ваеннаабавязаны снайпер.** — Мы прыбылі з самай раніцы, занялі раён баявых дзеянняў і ўжо гатовыя да выхаду. Мы падрыхтавалі пазіцыі, размеркаваліся па іх. Чакаем з'яўлення ўмоўнага ворага. У маёй рабоце самае галоўнае — заняць добрую пазіцыю і замаскіравацца, дачакацца праціўніка, выбраць галоўныя цэлі, адпрацаваць па іх і непрыкметна схавацца. Той факт, што снайпер на поле бою (гэта цэль нумар адзін), накладвае дадатковую адказнасць пры падрыхтоўцы».

Паводле яго слоў, на зборах няма нічога страшнага і спецыфічнага: «Мяне шмат чаму навучылі пры праходжанні тэрміновай службы, таму я гатовы з лёгкасцю выконваць любыя задачы. Дарэчы, адслужыў крыху менш за адзін год таму ў Слоніме. Падчас службы нам давялося выконваць задачы па ўмацаванні ўчасткаў дзяржаўнай граніцы. Сённяшнія ж зборы даволі насычаныя. Тут праводзяцца розныя заняткі, кожны дзень адпрацоўваем і тактыку. Я лічу, што правядзенне такіх збораў неабходна ў любым выпадку, таму што кожны мужчына павінен умець абараняць сваю Радзіму, умець карыстацца зброяй таксама неабходна».

Сваімі ўражаннямі ад збораў падзяліўся **яшчэ адзін ваеннаабавязаны — старшы стралок:** «Наша задача — разгортванне і абарона, па-простаму — паражэнне мішэняў. Мы павінны адпрацаваць свае агнявыя пазіцыі. Вялікая ўвага тут удзяляецца агнявой і тактычнай падрыхтоўцы. З улікам спецыфікі сучасных баявых дзеянняў нас навучаюць, як правільна страляць, перамяшчацца, эвакуіраваць параненых з поля бою. Ёсць моманты, якія змяніліся з таго часу, як я прайшоў тэрміновую службу. А служыў у 2010 годзе ў падраздзяленні сувязі. На такіх зборах упершыню. На работу прыйшла павестка, і літаральна праз некалькі дзён я адправіўся сюды. Вядома, калі ты знаходзішся ў камфортных умовах — дома, з сям'ёй, з дзецьмі — гэта адно. Але мы выдатна разумеем, што ўсе мужчыны павінны праз гэта прайсці. Час сёння неспакойны. Тут жа кожны можа паказаць, на што ён здольны, а якія моманты неабходна дапрацаваць. І, у прынцыпе, гэтыя зборы карысныя і патрэбныя для таго, каб было разуменне, ці гатовыя мы ў выпадку чаго ўстаць на абарону родных рубяжоў. На гэтых зборах выразна відаць, што ўсе нашы мужчыны гатовыя да абароны сваёй краіны».

Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КПБ БЕЛАРУСІ, С. РНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

«Звязда». № 49 — 14 сакавіка 1945 года

• На фронце

Войскі 2-га Беларускага фронту прадаўжалі наступленне. Наша газета паведамляла, што 12 сакавіка франтавікі авалодалі важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на подступах да Данцыга і Гдыні — гарадамі Тчэў (Дзіршаў), Вейхарава (Нойштадт) — і вышлі на ўзбярэжжа Данцыгскай бухты на поўначы ад Гдыні, заняўшы горад Пуцк (Путцыг). «**Адначасова войскі фронта занялі больш за 100 іншых населеных пунктаў, сярод іх — Квашын, Коплетцкау, Рэшке, Гневау, Грос Шлатау, Зелістрау, Польцын, Верблін, Шлавошык, Карвен. За 11 сакавіка ў гэтым раёне ўзята ў палон больш за 2 тысячы нямецкіх салдат і афіцэраў**», — пісала «Звязда».

Войскі 1-га Беларускага фронту, паводле звестак, пасля ўпорных баёў у гэты дзень штурмам авалодалі горадам і крэпасцю Кістжынь (Кюстрын) — важным вузлом шляхоў зносін і магутным апорным пунктам абароны немцаў на рацэ Одэр, які прыкрываў подступы да Берліна.

У Венгрыі, на паўночным усходзе і ўсходзе ад возера Балатон, наша армія адбівала атакамі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка і нанесла яму вялікія страты. У баях за 11 сакавіка ў гэтым раёне агнём нашай артылерыі былі знішчаны 54 нямецкія танкі і самаходныя гарматы. Апрача таго, паводле звестак, падбіты і падарваліся на нашых мінных палях 27 танкаў і самаходных гармат немцаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі былі збіты 102 варожыя самалёты.

На другіх участках фронту працягваліся баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

• У тыле

...Зусім нядаўна падлеткі з вёсак, дзіцячых дамоў, партызанскіх атрадаў прыйшлі на заняткі ў рамесніцкае вучылішча № 12 горада Ліды. «**Некаторыя з іх удастоены ўрадавых узнагарод. На грудзях маладых патрыётаў, былых народных мсціўцаў Шульгі, Драздоўскага, Пусека і другіх красуюцца медалі «Партызану Айчыннай вайны»**», — пісала наша газета ў гэты дзень.

Выхаванец вучылішча Дубін расказаў карэспандэнту «Звязды», чаму вырашыў вучыцца менавіта тут: «**Дружна мы жылі да вайны. Я вучыўся ў школе, бацька і маці працавалі. Вечарамі, калі ўся сям'я збіралася дамоў, у нас было так прыемна. Многа я думаў аб сваім будучым жыцці, марыў стаць слесарам... Цяпер мае мары здзейсніліся**».

Калі хлопчык пачынаў расказваць пра смерць блізкіх, — пісала наша газета, — твар яго рабіўся суровым, вочы напаўняліся гневам помсты ворагу. У дружным калектыве вучылішча сірата адчуў бацькоўскія клопаты і мацярынскую ласку... Савецкая дзяржава ўзяла яго на сваё поўнае ўтрыманне.

«**У дзевяць гадзін раніцы пачатак заняткаў. Групы сталяроў, слесараў і токараў займаюць свае месцы. Вучні слясарнага аддзялення асвоілі распілоўку і рэзку метала і прыступілі да вырабу інструменту. Кожны вучань гэтага аддзялення ўжо самастойна вырабляе малаткі і бабкі для кляпання кос. Значных поспехаў у рабоце дасягнулі вучні Комалаў, Чакураў, Мошка, Закрэўскі. 200 процэнтаў нормы — дзённы паказчык іх работы**», — паведамляла «Звязда».

Шумам такарных станкоў, стукам малаткоў і звонам піл напоўнены былі цэхі майстэрань. Сталяры, токары і слесары, захапіўшыся работай, паводле інфармацыі з газеты, не чулі сігналу на абедзенны перапынак, які ў падлеткаў доўжыўся дзве гадзіны: «**І вось зноў пасля перапынку з цэхаў майстэрань вырваўся шум працы. Малады прадвясенні вецер падхапіў яго і панёс далёка на суседнія вуліцы і кварталы. І нейкае прыемнае пачуццё ахапляе цябе, калі чуеш гэтую зладжаную песню працы ў разбітым і зруйнаваным горадзе. Горад жыве і ваюе. У ім куюцца працоўныя рэзервы — новае папаўненне рабочага класа**».

Калі надыходзіў час адпачынку, юныя майстры ішлі вячэраць. Пасля, — пісала «Звязда», — заходзілі ў інтэрнат. Хто чым займаўся: адны рыхтавалі і правяралі лыжы, другія заходзілі ў чырвоны куток пачытаць газету, кнігу, паслухаць радыё. Аматары мастацкай самадзейнасці рыхтаваліся да чарговага выступлення: «**Група лыжнікаў, вяртаючыся з прагулкі, падыходзіла да вучылішча. Гучэў голас запявалы тав. Шульгі:**

«По долинам и по взгорьям
шла дивизия вперед»...

У такт кроку падхапілі гэтую песню ўсе хорам, і яна стала зычнай, бадзёрай, магутнай. Лясное рэха паўтарыла яе матыў».

Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Премьерлизинг» (Продавец).

Электронные торги состоятся 24.03.2025.

Лот № 1:
Магазин «Универсам» с инв. № 200/С-55222,
площадь – 942,8 кв. м.

Адрес: Витебская область, г. Витебск, ул. Лазо, д. 129А.

Земельный участок № 240100000001002906, 0,3738 га.
Право постоянного пользования.
Обременения: ипотека, аренда.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 711 966,42 доллара США.
Задаток – 228 071,32 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **19.03.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,
torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Премьерлизинг» (Продавец).

Электронные торги состоятся 24.03.2025.

Лот № 1:
Торговое помещение (инв. № 350/D-195209),
площадь – 594,3 кв. м.
Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Фадеева, 1-1.

Торговое помещение (инв. № 350/D-195209)
находится в капитальном строении (инв. № 350/С-51306),
расположенном на земельном участке 340100000003000135,
0,2933 га.

Право постоянного пользования.
Обременения: ипотека, аренда.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

